Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

***Па вёсках нашага краю***

# Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні

***гісторыка-краязнаўчы нарыс***
***да 550-годдзя з часу першага ўпамінання***
***в. Дзівін Кобрынскага раёна***

Кобрын
2016

ББК 91.9:26.89(4Беи)
Д 43

***Складальнікі:***

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

*Л. С. Дардзюк* - бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні** : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – 50 с. : каляр. фат.

# Прадмова

***«Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні»*** - трэцяе выданне з цыкла бібліяграфічных паказальнікаў пад агульнай назвай «*Па вёсках нашага краю*».

Першае выданне «*Сузор'е кобрынскіх вёсак*» было прысвечана 450-годдзю першага ўпамінання шматлікіх вёсак Кобрыншчыны на старонках гісторыі, першакрыніцай якіх з'явілася «Рэвізія Кобрынскай эканоміі, складзеная ў 1563 года каралеўскім рэвізорам Дзмітрыем Сапегай». Другое выданне - інфармацыйна-пазнавальны даведнік «*Скрозь памяць стагоддзяў*» - прысвечана 500-гадоваму юбілею вёсак Балоты, Стрыгава Кобрынскага раёна, які адзначаўся ў 2013 годзе.

Гісторыка-краязнаўчы нарыс *«Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні»* выдаецца да 550-годдзя з часу першага згадвання ў пісьмовых крыніцах в. Дзівін.

Вёска багата сваімі традыцыямі, паданнямі, культурай і гісторыяй. Зараз мала хто памятае, што Дзівін з 1940 года да 1959 года быў цэнтрам раёна, у які ўваходзіла палова тэрыторыі цяперашняга Кобрынскага. Непаўторны імідж мае гэты куток Кобрыншчыны. Дзівін - адна з самых вялікіх вёсак у раёне. Тут дзівосная прырода, багатыя лясы. Сапраўдная жамчужына вёскі – возера Любань. Тры аб'екты в. Дзівін - царква Параскевы Пятніцы, Прачысценская царква, брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан - занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Славіцца Дзівін сваімі высокамастацкімі, зробленымі з вялікім густам і натхненнем, вырабамі народнай творчасці. На дзівінскай зямлі нарадзіліся многія выдатныя людзі, жыццё і дзейнасць якіх з'яўляюцца прыкладам самаадданай працы, бескарыслівага служэння людзям.

Нягледзячы на свой салідны ўзрост, Дзівін не старэе. За апошнія гады вёска значна змяніла свае аблічча. Дарэчы, Дзівін у 2008 годзе атрымаў новы статус – стаў аграгарадком. Мясцовыя жыхары ганарацца сваёй малой радзімай, старанна працуюць на яе зямлі.

Паказальнік мае наступную структуру:

**Прадмова**
I. Дзівін: аповед аб вёсцы
II. Экскурс у гісторыю краю: храналогія асноўных дат
**III.** Дзівін дзівіць дзівам: паходжанне назвы сяла
**IV.** Помнікі, памятныя мясціны краю
**V.** Вядомыя людзі, ураджэнцы в. Дзівін
**VI**. Сучасны Дзівін
**Спіс крыніц**

Выкарыстоўваўся матэрыял з архіваў Дзівінскай публічнай бібліятэкі.




**Сярод дубраў, лугоў шырокіх,**
**Дзе песня родная так звонка льецца,**
**Ляжыць вялікае палескае сяло,**
**Што так прыгожа Дзівінам завецца**

*Ю. Максімовіч*

# I. Дзівін: аповед аб вёсцы




***Агульныя звесткі***

**Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** (мясцовая назва Дывэн) - вёска, цэнтр Дзівінскага сельсавета.

Першае ўпамінанне аб Дзівіне ў летапісных крыніцах адносіцца да 1466 года. Шмат трагічных старонак перажыло гэта сяло на поўдні Кобрынскага раёна. У XV стагоддзі Дзівін неаднаразова падвяргаўся набегам крымскіх татар, аб чым сведчаць назвы ўрочышчаў, напрыклад, Татарская парасля, што знаходзіцца амаль на мяжы з Украінай. Яшчэ і сёння тут можна пачуць старажытныя песні аб тым сумным часе, калі татары забіралі людзей у няволю. Памяць захавала голад 1853-1855 гадоў, страшны пажар 1858 года. Не абмінулі вёску і наступныя войны… Але Дзівін выстаяў. Сёння гэта сучасная прыгожая вёска, якая злучана шасейнымі дарогамі са шматлікімі гарадамі Беларусі.

***Геаграфічнае становішча***



Дзівін знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы Кобрынскага раёна на адлегласці 33 км ад раённага цэнтра (г. Кобрын), за 79 км ад абласнога цэнтра (г. Брэст). Тэрыторыя гаспадаркі размешчана ў паўднёва-заходняй глебава-кліматычнай акрузе Рэспублікі Беларусь і адносіцца да Целяханска-Жыткавіцка-Маларыцка-Дзівінскага раёна дзярнова-падзолістых, пясчаных, супясчаных і тарфяна-балоцістых глебаў нізіннага тыпу. Транспартныя сувязі па аўтадарогах на Брэст, Драгічын.

***Рэльеф***

Рэльеф тэрыторыі з'яўляецца тыповым для Палесся. Ён уяўляе сабою плоскую раўніну са шматлікімі дробнымі мохавымі балотамі - багнамі і з вялікімі нізіннымі трысняговымі неглыбокімі тарфянікамі, занятымі сенакосамі. Сярод гэтай раўніны сустракаюцца пясчаныя дзюны і грады, не замацаваныя лесам, якія разносяцца ветрам.

***Прыродныя ўмовы і клімат***

Гэта адзін з раёнаў, які адрозніваецца параўнальна цёплым кліматам, што садзейнічае добраму развіццю сельскагаспадарчых раслін. Працягласць вегетацыйнага перыяду тут даходзіць да 207 дзён, з іх 160 прыходзіцца на перыяд з тэмпературай вышэй за 10 градусаў. Сярэдняя працягласць зімы, уключаючы перадвясенні перыяд, складае 132 дні. Дата першага асенняга замаразка - прыкладна 18 верасня. Дата апошняга вясенняга замаразка - 29 мая. Сярэдняя тэмпература паветра - прыкладна + 7, 3 градуса. Сярэднегадавая колькасць ападкаў – 540 мм. Таўшчыня снежнага покрыва не больш за 10-15 см. Зімой часта бывае адліга.

***Архітэктура***

Сучасная вёска захавала старажытную лінейную планіроўку. Асноўныя кампазіцыйныя восі - вуліцы Савецкая і Леніна. На гандлёвай плошчы на скрыжаванні вуліц Леніна і Савецкай сфарміраваўся грамадскі цэнтр, які ўключае адміністрацыйны будынак, зблакіраваны з Палацам культуры, універмаг, кафэ-сталовую, магазін, гасцініцу, школу-інтэрнат, аптэку. Плошча пакрыта бетоннымі плітамі, упрыгожана кветнікамі і газонамі, з захаду да яе прымыкае сквер. Пераважаюць аднапавярховыя жылыя дамы сядзібнага тыпу. Паводле генплана 1976 года (Брэстграмадзянпраект) было прадугледжана будаўніцтва 1-2-павярховых у 2-х узроўнях і секцыйных дамоў, стварэнне каля возера парка са спартыўнай зонай. Зона адпачынку - на возеры Любань.



***Дзівінскі строй***

Народны дзівінскі касцюм мае асноўныя прыкметы народнага касцюма кобрынскага строю, але разам з тым можна адзначыць некаторыя асаблівасці вырабу і ўпрыгожвання народнага адзення ў в. Дзівін, а таксама звычаяў, абрадаў і рытуалаў, звязаных з выкрыстаннем адзення. У вёсцы былі шырока распаўсюджаны

белыя палатняныя спадніцы, якія, як правіла, «затыкалі» па нізе, часцей па ўсяму полю «балхвой» прыгожымі рознакаляровымі прадольнымі палосамі. Часта на пярэдняй пале затыкалі толькі тую частку, якая была бачна з-пад фартуха. Пярэдняя полка мела больш просты дэкор. Спадніцы, якія шылі з сукна, называліся андаракам. Андарак, як святочная вопратка, павінен быў быць прыгожым. А для гэтага яго шылі шырокім (у 4-5 полак) і доўгім як з аднатоннай тканіны, так і ў палоску. Андаракі, як правіла, былі цёплай вопраткай, і іх насілі зімой і ў святы. Буднія андаракі ткалі карацей, а святочныя - даўжэй.


Спадніца–«палатнянік» з фартухом. Вёска Дзвін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст. Фота М. Мельнікава

Выразны і цікавы дзівінскі жаночы строй. Касцюм складаецца з латухі, крайкі (пояса), гарсэціка, фартуха, палатняніка або летніка (андарака), сарочкі, плата і каптура, шлячка. Асабліва прыгожыя фартухі ў агульным для Дзівіна чырвона-белым паласатым стылі з непаўторнымі адценнямі ўзораў. Кожная жанчына мела некалькі фартухоў, якія адрозніваліся колькасцю палос, іх шырынёй, узорам. Некаторыя палосы маюць геаметрычна набраны ўзор, часцей за ўсё - ромбы. Кабета, надзяваючы фартушок, хацела паказаць сваё майстэрства ў ткацтве і вышыванні. Каб разнастаіць узор, часта надзявалі (накладвалі) некалькі фартухоў такім чынам, каб вылучаўся галоўны ўзор.

Пазіраеш на дзівінскія ўборы і захапляешся іх хараством, багаццем фантазіі майстрых. І якая ва ўсіх вырабах гармонія і густ! Цікавыя абрусы (настольнікі), палатнянік (кужэльна-баваўняная спадніца, вытканая перабіраннем), ручнікі… Плат-намітка дасягаў калісьці пяці метраў у даўжыню і ўпрыгожваўся з трох краёў. Іх часта вышывалі наборам, аздаблялі карункамі. Плат меў абрадавае прызначэнне: у ім вянчаліся, хавалі нябожчыц.

А дзівінскія кажушкі? Яны таксама адрозніваюцца сваім чырвоным колерам, аздобай полачак унізе футрам, а таксама вышыўкай.

Галаўныя ўборы (шлячкі) характэрныя таксама для гэтай мясцовасці. Дзяўчаты павязвалі шлячок на валасы так, што прыкрываліся патыліца і лоб. Так хадзілі нават у моцны мароз. Замужнія жанчыны насілі чапец (каптур).

Наогул, трэба адзначыць, што этнографы, супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, якія пабывалі ў Дзівіне, адносяць вёску да ліку незвычайных. Іх здзіўляе, што рэчы, выраблены рукамі ўмельцаў шмат гадоў, захаваліся тут, зроблены з вялікім густам, фантазіяй і выдумкай.

# II. Экскурс у гісторыю краю: храналогія асноўных дат

Вёска Дзівін мае багатую гістарычную спадчыну.

## *Старажытныя крыніцы згадванняў аб Дзівіне*

Сяло Дзівін - старажытнае пасяленне, згадванне аб якім мы знаходзім у 1-4 тамах «*Актаў, выданых Віленскай камісіяй для разбору старажытных актаў*». Так, у 4-м томе ў «Акце 1699 года» пад назвай «Пастанова дваран Брэсцкага ваяводства ў выніку з'езда дэпутатаў усіх ваяводств» 21 снежня 1698 года (на старонцы 289) упамінаецца Дзівін. У другіх тамах успамін ідзе пад назвамі Дзівінская Прачысценская царква, атрыманне Дзівінам магдэбургскага права.

У размежаванні Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага ў 1546 годзе згадваецца сяло Дзівін і возера. Вось адзін з урыўкаў гэтага дакумента «*1546 год Жніўня 3. Межы паміж Вялікім княствам Літоўскім і Каронаю Польскаю ў канцы першай палавіны 16 стагоддзя*»: «*Подстаростий Берестейский з людьми Дивина поведал: што менил подстаростий Ратенский з людьми ратенскими Кривый Брод, так его прозывают Межигоре, а тую реку зовут Дивинка и по той реке озеро зовут Дивино; и с того озера великого князства Дивина речка Нетеча вышла, и тая речка течёт якобы на два стременья, по острову великого князства и понерла мало не у двух милях от границы Челищовское; и куды они вели тыми границами, т.е. все великого князства отчизна наша Дивинская, и тое озеро и речку зовут Дивином, по которому озере и речце и село зовут Дивином...*».

***1466 г.*** - першае ўпамінанне ў летапісе.

***1546 г.*** - мястэчка ў Дзівінскай воласці Брэсцкага павета ВКЛ.

***1566 г***. -184 двары, цэнтральны рынак і 5 вуліц, якія ад яго адыходзілі.

***1629 г.*** - кароль Жыгімонт III пацвердзіў права дзівінцаў на штотыднёвы кірмаш па чацвяргах.

***1642 г.*** - Дзівін атрымаў Магдэбургскае права, аднак войта са шляхты прызначыў кароль.

***1668 г.*** - горад у Палескім ключы Брэсцкай эканоміі (53 валокі зямлі, 2 млыны, агароды, карчма).

***1682 г***. -у мястэчку 2 царквы (мелі 2 вольныя валокі зямлі), ратуша (2 валокі), касцёл (4 валокі), 2 млыны, карчма.

***1789 г.*** - горад і двор у Дзівінскім ключы Брэсцкай эканоміі. У горадзе: рыначная плошча, 4 вуліцы, 194 гаспадаркі, 872 жыхары; у двары: жылы дом, бровар, студня і іншыя гаспадарчыя пабудовы.

***1795 г***. - у складзе Расійскай імперыі (у Кобрынскім павеце). Было 4 вуліцы: у напрамку Кобрына - Кобрынская, у напрамку Ратна - Ратненская, да Павіцця - Павіццеўская, да Брэста - Брэсцкая. У сувязі з ростам насельніцтва вуліцы яго пашыраліся на захад. З запісаў 1795 года Пятніцкай царквы вядома, што ў Дзівіне было 70 хат: на Кобрынскай вуліцы - 30, на Ратненскай - 20, на Брэсцкай - 10, на Павіццеўскай - 10. Колькасць насельніцтва - 774 чалавекі.

***1797 г., сакавік***. - мястэчка Дзівін: 988 жыхароў падаравана нашчадкам генерал-фельдмаршала графа П. А. Румянцава-Задунайскага.

З запісаў 1800-1802 гадоў вядома, што раней мястэчка належыла графу Румянцаву, а потым перайшло ва ўласнасць памешчыка Ягміна і да 1885 года належыла яго нашчадкам, а пасля перайшло да Аляксандры Ігнатаўны Ягмін, жонкі Паўла Паўлавіча Ягміна. У 1896 годзе замест Ягміна гаспадаром маёнтка Дзівін стаў Іван Ягоравіч Шэвіч, які ў 1899 годзе прадаў маёнтак шляхціцу Арлоўскай губерніі Івану Цяплову. Пачынаючы з 1913 года памешчык Цяплоў прадаваў маёнтак па частках па 70-200 рублёў за дзесяціну.

Пераходнай формай паміж горадам і сялом былі мястэчкі, населеныя ў асноўным рамеснікамі і гандлярамі. У сярэдзіне XIX стагоддзя на тэрыторыі сучаснага Кобрынскага раёна былі два мястэчкі - Дзівін і Гарадзец. Мястэчка Дзівін было заснавана на «суровым карні» пры правядзенні валочнай рэформы. Яно знаходзілася на шляху з Кобрына ў Ковель.

***1801 г.*** - у Гродзенскай губерніі.

***1819 г.*** - сяляне і жыхары мястэчка (звыш 200 двароў, 1000 жыхароў) адмовіліся выконваць павіннасці на карысць свайго ўладальніка да канчатковага разгляду справы аб іх вольнасці.

***1853-1855 гг***. - жыхароў Дзівіна напаткаў вялікі голад. У гэтыя гады больш за ўсё памерла людзей ад пухліны і гарачкі: у 1854 годзе памерла 152, а ў 1855 годзе - 90 чалавек. Памірала больш, чым нараджалася.

Сялянскія хаты мелі вельмі бедны выгляд. Псаломшчык Шырынскі апісваў іх так: «*Дамы сялян непрыглядныя, у большасці сваёй без трубы, курныя, акенцы маленькія*». Сяляне хадзілі ў пасталах, насілі цёмныя світкі, абшытыя шарсцянымі шнуркамі чырвонага і сіняга колеру, чырвоны пояс. На галаве летам насілі картузы ці саламяныя капялюшы. З упрыгожванняў у жанчын былі пярсцёнкі на руках, на шыі – бісер.

***1858 г.*** - у мястэчку адбыўся моцны пажар. Згарэлі народнае вучылішча, бальніца і яўрэйскі квартал.

*Да 1861 года сяляне мястэчка Дзівін былі прыгоннымі. Яны павінны былі выконваць баршчыну на карысць памешчыка. Акрамя таго, павінны былі ўтрымліваць на свае сродкі свяшчэннікаў і псаломшчыкаў. Сяляне аплачвалі таксама розныя царкоўныя абрады: 15 капеек за крыжык, пры пахаванні за малітву і венчык з дзіцяці -10 капеек, з дарослага - 20 капеек. Сяляне займаліся выключна земляробствам. Зямельны надзел у сялян быў неаднолькавы. На кожнага поўнага гаспадара на Ратненскай вуліцы ворнай зямлі і сенакосаў адводзілася 24 дзесяціны, на Кобрынскай - 18, на Брэсцкай - 22. Землі для выпасу жывёлы былі абмежаваны. Лесу сяляне не мелі, акрамя дробнага, прызначанага толькі на дровы. Многія сяляне мелі патрэбу ў зямлі. Яны арэндавалі яе ў памешчыка і асобных жыхароў за трэць ураджаю.*

***1886 г.*** - мястэчка, цэнтр воласці, 159 двароў, 1644 жыхары і 5516,25 дзесяціны зямлі (у 1890 годзе), валасное праўленне, 3 праваслаўныя царквы - Успенская, Пятніцкая і Прачысценская (511,75 дзесяцін зямлі ў 1890 г.), сінагога, школа, 5 крам, заезны двор, 2 піцейныя дамы, 3 кірмашы. Каля мястэчка знаходзіўся маёнтак Дзівін - уладанне А. Ягміна, ветраны млын, 8135,5 дзесяцін зямлі (разам з іншымі маёнткамі і фальваркамі А. Ягміна).

***1888 г.*** - у мястэчку 2516 жыхароў, у праваслаўным прыходзе 3663 вернікі.

***1897 г.*** - мястэчка: 873 двары, 3796 жыхароў, 3 царквы, сінагога, яўрэйскі малітвенны дом, народнае вучылішча (1899-1890 гады - 74 хлопчыкі і 9 дзяўчынак; 1892-1893 гады - 71 хлопчык і 9 дзяўчынак), сельская лячэбніца, валасное праўленне, паштовае аддзяленне, 2 хлебазапасныя магазіны, 15 дробных крам, маслабойня, 14 млыноў, піцейны дом, 6 аднадзённых кірмашоў на год. У маёнтку - 60 жыхароў.



***1905 г.*** - у Дзівіне 3967 жыхароў, у народным вучылішчы 100 хлопчыкаў, 4 дзяўчынкі, у маёнтку 58 жыхароў.

***1915 г.*** - мястэчка і маёнтак акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі, а з ***1919 г.*** - польскімі войскамі.

***1921 г.*** - у складзе Польшчы, цэнтр гміны Кобрынскага павета Палескага ваяводства: мястэчка - 373 двары; фальварак, хутары і калонія - 71 двор, 403 жыхары.

***1926 г.*** - меліся наступныя дзяржаўныя ўстановы: паштовае аддзяленне, участак дзяржаўнай паліцыі, 2 паравыя млыны.



***1931 г.*** - Дзівінская гміна налічвала 8326 жыхароў, 84 населеныя пункты, займала плошчу ў 280 кв. км. Працавалі яўрэйская бібліятэка, тэатральны і харавы гурткі.

***1935 г.*** - у Дзівіне налічвалася 4000 жыхароў, меліся 2 царквы і касцёл (Успенская царква згарэла ў 1915 годзе), гасцініца, рэстаран. Штогод адбываліся кірмашы. Медыцынскае абслугоўванне прадстаўлена аптэкай, двума ўрачамі, адной акушэркай.

***1939 г.*** - у складзе БССР.

***1940 г., 15 студзеня*** - цэнтр раёна і сельсавета Брэсцкай вобласці. Працавалі паштовае аддзяленне, сямігадовая школа (400 вучняў), аптэка, бальніца з амбулаторыяй, ветпункт, народны дом, 20 прыватных крам, хлебны і кніжны магазіны, 2 маторныя млыны, 3 хлебапякарні, бойня жывёлы, рэстаран, сельпо, абутковая і кавальская арцелі, завод прахаладжальных напіткаў, маслазавод. Дзівінскі раён налічваў 138 населеных пунктаў, 11 сельсаветаў, 26117 жыхароў.

***1941 г., 24 чэрвеня*** - Дзівін акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У час фашысцкай акупацыі непадалёку ад сяла дзейнічалі партызанскія атрады імя Чкалава, Шчорса, Калініна, Катоўскага, Чапаеўскі, Фёдарава, 44-ы баявы і брыгада Флегантава.

***1944 г., 21 ліпеня*** - Дзівін вызвалены часцямі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту, куды ўваходзілі 9-ы гвардзейскі стралковы атрад, 212-я стралковая дывізія, 12-я гвардзейская дывізія. У цэнтры вёскі пахаваны 74 савецкія воіны і 2 партызаны, якія загінулі ў баях пры вызваленні вёскі. 1450

жыхароў вёскі, якія былі расстраляны гітлераўскімі карнікамі ў 1942 годзе, пахаваны на тэрыторыі завода металічных вырабаў.


Газета, якая выдавалася ў Дзівіне – раённым цэнтры

Ленінскі прызыў

Задача партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых арганізацый раёна—правільна спалучыць усе сельскагаспадарчыя работы, мабілізаваць працаўнікоў палёў раёна на паспяховае завяршэнне сельскагаспадарчага года, на дастойную сустрэчу 31 гадавіны Кастрычніка і 31-годдзя Беларускай ССР.

Паспяхова завяршыць сельскагаспадарчы год!

Дошка гонару

Перадавікі бульбанарыхтовак

***1945 г.*** - адноўлена МТС, пачала друкавацца раённая газета «Ленінскі прызыў» (адказны рэдактар А. Мельнікаў).

***1947 г.*** - пачалося будаўніцтва няпоўнай сярэдняй школы, працавалі раённы клуб, бібліятэка, новы магазін.

***1949 г.*** - у вёсцы створаны калгас «Зара».

***1950 г.*** - адкрыты дзіцячыя яслі, пачалося будаўніцтва новага будынка райбальніцы.

***1959 г., 8 жніўня*** – вёска ў складзе Кобрынскага раёна.

***1970 г.*** – вёска, цэнтр калгаса «Новае жыццё», 4677 жыхароў.



***1971 г.*** - пабудавана новая школа. У школе было 645 вучняў, класаў-камплектаў - 27, педагагічны калектыў - 45 чалавек.

***1999 г., 1 студзеня*** - 1533 двары, 4293 жыхары, будынкі выканкама сельсавета і адміністрацыі калгаса «Новае жыццё», Дом культуры, 3 бібліятэкі, музычная, спартыўная і сярэдняя школы, бальніца, школа - інтэрнат, дзіцячы садок, ветлячэбніца, аддзяленне сувязі, камбінат бытавога абслугоўвання, кафэ, 6 магазінаў.

# III. «Дзівін дзівіць дзівам»: паходжанне назвы сяла

*Чароўную казку шапоча нам вецер,*
*І з выраю птушкі дадому ляцяць…*
*Пра Дзівін – сапраўднае дзіва на свеце,*
*Пра вёску сваю будзем песню спяваць.*

*Ю. Піваварава*

Стагоддзі праляцелі над Дзівінам, але ва ўсе часы людзей цікавіла пытанне, адкуль такая дзівосная назва.

Існуе шмат версій. Адна з іх - прыгожая мясцовая легенда. …Там, дзе сёння Дзівін і яго ваколіцы, была непраходная багна, шумелі цёмныя лясы, у якіх гаспадарыў вечны змрок, а вакол - бездарожжа. Сярод гэтага таямнічага лесу знаходзілася вялікая сонечная паляна, дзе расло шмат духмяных траў і дзіўных кветак. Хто выпадкова трапляў сюды, захапляўся тым дзіўным месцам, сапраўдным цудам. А потым сюды прыходзілі іншыя, каб палюбавацца цудам сярод непраходнага лесу, гаворачы пры гэтым «дзіва» (ці на мясцовым дыялекце «дыво»). Пазней тут пасяліліся людзі, захаваўшы за гэтым месцам назву «Дзівін». Так гаворыць легенда.

А вось што думаюць па гэтаму пытанню вучоныя.

В. А. Жучкевіч у сваім тапанімічным слоўніку падтрымлівае варыянт легенды, што назва Дзівін (рус. Дивин, а мясцовая - Дывін) паходзіць ад слоў «дзівіць», «дзіва» у значэнні «цуд». Магчыма, сама назва «Дзівін» узнікла значна раней, чым пасяленне (прыблізна ў X-XII стагоддзях), і захавала сваю пачатковую мясцовую форму - Дывин, Дэвин, Дивин.

У «Тлумачальны слоўніку» Уладзіміра Даля чытаем: «Диво - чудо, невидаль, диковина. Я диву дался, изумился. Я дивом дивился, очень дивился». Слова «диво» мела яшчэ некалькі значэнняў - дзівіць людзей, падманваць, палохаць і г.д. Здаўна ў славян бытаваў выраз: «мне дивится», што азначае «мне чудится», «мне кажется». Яшчэ ў Даля знаходзім адно значэнне слова «диво – чудовище, зловещая птица». Усё вышэй пералічанае дае падставу паразважаць над многімі значэннямі гэтага слова. Сяленне знаходзілася далёка ад абжытых тэрыторый, сярод старажытнага лесу. Жыццё людзей было цяжкім, дарог не было. Шлях туды быў доўгім і цяжкім. Магчыма, у адносінах да гэтага месца людзі заўсёды вымаўлялі вобразнае слова «диво» ў значэнні «цяжка», «далёка», «доўга» і г.д. Доўгае жыццё ў ізаляцыі сярод некранутага лесу, далёка ад абжытых земляў садзейнічалі фарміраванню ў дзівінцаў своеасаблівых рыс характару: індывідуалізм,

скрытнасць, асцярожнасць, беражлівасць, боязь суадносінаў і кантактаў. Можна здагадвацца, што нашы продкі лічылі мясцовых жыхароў «дивами», што значыць лясными духамі, галасы якіх часта палохалі іх у навальнічныя ночы, але і самі «духі» баяліся сустрэчы з іншымі людзьмі. Магчыма, адно з гэтых значэнняў слова «диво» адлюстроўвае сапраўдны сэнс тапоніма «Дзівін» (Дывін).

У сакавіку 2002 года ў абласной газеце «Зара» быў надрукаваны артыкул А. Прашчуровіча «Откуда имя твоё, Дивин?» У гэтым артыкуле аўтар прапаноўвае новую версію паходжання назвы сяла Дзівін. На яго думку, назва сяла паходзіць ад назвы лекавай расліны - каравяка. Па ўкраінску гэта расліна называецца «дивина» (*націск у слове на апошні склад, а літара «и» вымаўляецца як «ы»*). Каравяк у вялікай колькасці расце ў ваколіцах Дзівіна.



Найбольш багата каравяком паўночнае пабярэжжа возера Любань, дзе прыгожая высокая расліна з прадаўгаватымі эліптычнымі завостранымі лістамі займае значныя плошчы. Кветка «дивины» ўвасабляе чысціню дзявочага кахання, якое, хутка загарэўшыся і выканаўшы сваю прыродную функцыю, таксама хутка гасне. Справа ў тым, што кожная асобная кветка каравяка жыве ўсяго адзін дзень - ад усходу сонца да яго заходу. На другі дзень наступная кветка на золку раскрываецца, а вечарам вяне. І так з чэрвеня па жнівень «гарыць» кветка, радуючы вочы прыгожым залаціста-жоўтым колерам, быццам дзяўчына на выданні чакае свайго каханага. Лекавыя ж уласцівасці гэтай расліны ўніверсальныя. Такім чынам, старая народная назва прыгожай лекавай расліны «дивина» стала правобразам назвы пасялення.

У 2015 годзе выйшла ў свет кніга С. В. Барыса «Сцяжкамі дзядоў: народны быт беларусаў», у якой сцвярджаецца думка: ёсць усе падставы меркаваць, што назву веска атрымала таму, што ў старыя часы яна была цэнтрам мастацкага ткацтва і здзіўляла навакольныя вёскі. Дзе яшчэ, апранаючыся, жанчыны накладаюць па некалькі фартухоў, дзе яшчэ знойдуцца наміткі да 5 метраў даўжынёй? Гэта ўсё дзівінскі строй.

Такім чынам, цяжка ўявіць, што мелі на ўвазе нашы продкі, даючы гэтаму сяленню такую назву. Зразумела толькі адно: яны ўбачылі яркую індывідуальную сутнасць гэтай мясцовасці, назваўшы яе Дзівінам.

# IV. Помнікі, памятныя мясціны Дзівіна

***Помнікі археалогії***: стаянка і паселішча на беразе возера Любань.

За 5 км на паўночны ўсход ад вёскі Дзівін, на пясчаных узгорках каля возера Любань, ва ўрочышчы Града (Дзівінскія пяскі) захавалася ***неалітычная стаянка.*** Выявілі ў 1938 годзе Данілевіч і Абухоўскі, абследаваў у 1963-1964 гадах У. Ф. Ісаенка. На стаянцы знойдзены наканечнікі стрэл, крамянёвыя прылады працы, мікраліты. Стаянка адносіцца да мезаліту і неаліту.

***Паселішча (археал.).*** За 3,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Біндзюга на ўсходнім беразе возера Любань, на пясчаным узвышшы (3 м над узроўнем вады ў возеры). Плошча каля 0,5 га. Выявіў у 1981 годзе М. У. Бычкоў. У агаленнях выяўлены культурны пласт магутнасцю 0,1-0,2 м, у ім знойдзены крамянёвыя прылады працы (наканечнік стралы трохвугольнай формы, 2 скоблі, 2 скрабкі, 3 пласціны, нуклеус) і фрагменты ляпной керамікі бронзавага веку. Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР (НАН Рэспублікі Беларусь).

## *Помнікі архітэктуры*

**Свята-Параскева-Пятніцкая царква**



Размешчана на галоўнай вуліцы вёскі (былая Кобрынская) алтаром на захад. Гэта сведчыць, што першапачаткова яна была касцёлам. Пабудавана ў 1740 годзе намаганнямі святара Яна Антонія Ваяводскага. У 1869-1870 гадах будынак перароблены (інжынер-архітэктар Чэкмасаў, архітэктар Барташэўскі) і перададзены праваслаўнаму ведамству. У часы Першай сусветнай вайны царква пашкоджана пажарам, у 1917 годзе адноўлена. У

1962 годзе яе закрылі, з часам прыйшла ў нягоднасць. У 1990 годзе зроблены рамонт храма. Царква асвячона архіепіскапам Брэсцкім і Кобрынскім Канстанцінам.

Пра Пятніцкую царкву ў народзе склалася паданне. Польская вялікая княгіня Літоўская Ганна (вотчынніца м. Дзівін) праязджала са сваёй дачкой Праскоўяй цераз Дзівін. У дарозе дзяўчынка захварэла, і Ганна дала абет - пабудаваць у мястэчку Дзівін царкву, калі яе дачка ачуняе. Дачка паправілася, і царква была пабудавана з круглых сасновых бярвенняў, аб чым выдана грамата, зацверджаная ў Брэсцкім ваяводстве.

Царква двухзрубная, складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і пяціграннай апсіды з 2 прыбудоўкамі. Галоўны фасад вылучаны 2 чацверыковымі вежамі з фігурнымі яруснымі купаламі і цыбулепадобнымі купалкамі. Шчыт даху мае кілепадобны абрыс і знаходзіцца ў паглыбленні паміж вежамі. Сцены вертыкальна ашаляваны, прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, якія аздоблены вітражамі ў выглядзе крыжа. Агульны гонгавы дах пад апсідай за кошт трохвугольных застрэшкаў пераходзіць у вальмавы. Інтэр'ер зальны. Два чатырохгранныя слупы каля ўвахода падтрымліваюць хоры. Збоку перад царквой у другой палове XIX стагоддзя пастаўлена драўляная званіца пад шатровым гонтавым дахам. У інтэр'еры захаваўся іканастас 1830-х гадоў. Царква - помнік архітэктуры, які спалучае будаўнічыя прыёмы мясцовага драўлянага дойлідства з элементамі барока.

Храм унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

**Свята-Прачысценская царква**



Знаходзіцца ў цэнтры в. Дзівін. Тып храма з трохчасткавай аб'ёмнай кампазіцыяй традыцыйны для драўлянага культавага дойлідства Беларусі. Помнік архітэктуры псеўдарускага стылю.

Хадайніцтва аб будаўніцтве новай царквы з-за трухлявасці старой было пададзена прыхаджанамі яшчэ ў 1879 годзе. Узведзена ў 1902 годзе.

Дамінуючы франтальны аб'ём мае складаную зрубную канструкцыю: над папярочным зрубам бабінца з кубападобнай узвышанай часткай узведзены 3-ярусны васьмярык званіцы пад шатром з макаўкай у завяршэнні. 4-часткавая аб'ёмная кампазіцыя складаецца з прытвора-званіцы, кароткага бабінца, малітоўнай залы, апсіды. Унутры апсіда вылучана драўляным іканастасам. Над пакатым 4-схільным дахам асноўнага аб'ёму надбудаваны нізкі 4-гранны пастамент для 8-граннага барабана, завершанага цыбулепадобным купалам. Уваход арганізаваны праз нізкі прытвор пад двухсхільным дашкам. Фасады дэкарыраваны фрызамі і падзорамі. У інтэр'еры драўляны іканастас.

Мастацкую каштоўнасць маюць абразы XVIII-XIX стагоддзяў: «Прападобны Ануфрый», «Божая Маці Адзігітрыя», «Святыя Варвара і Андрэй», «Святыя Мікола і Мітрафаній», «Мікола Цудатворац», «Дабравешчанне», «Узнясенне Хрыстова», «Нараджэнне Божай Маці», «Спас Пантакратар». Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Храм дзейнічае.

## *Помнікі гісторыі*

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.** Пахаваны 74 воіны 212-й



стралковай дывізіі і два партызаны, якія загінулі пры вызваленні вёскі. Усе яны загінулі ў гады вайны на тэрыторыі колішняга Дзвінскага раёна ў баях з нямецка-



фашысцкімі акупантамі. На магіле ў 1949 годзе пастаўлены трохпрыступчаты чатырохгранны абеліск вышынёю 5,5 м. На помніку высечаны надпісы: «*Ад савецкіх, партыйных і камсамольскіх арганізацый Дзвінскага раёна. 7 лістапада 1949 г.*» і «*Вечная слава героям, якія загінулі ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. 1941-1945 гг*». Перад абеліскам - тры надмагільныя пліты з прозвішчамі

загінуўшых і надпісам: «*Стагоддзі не згладзяць у памяці пакаленняў імёны верных сыноў сацыялістычнай Радзімы, якія аддалі сваё жыццё за яе будучыню, за жыццё на зямлі*».



**Магіла ахвяр фашызму.** Пахаваны 1450 мірных жыхароў, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1942 годзе.

У 1951 годзе на магіле пастаўлены абеліск.

## *Помнікі прыроды*

**Сувораўскі дуб**



Вялізны дуб у тры абхваты
Здаўна сярод палешукоў,
Расхрыстаны і дзікаваты,
Завецца ён – Сувораў дуб.
Дымілі ў ціхай вёсцы печы.
Ламалі крылле ветракі.
І на яго крутыя плечы
Буслы сядалі і вякі.
Зямлю свідруе дуб карэннем,
Нязломны, быццам паляшук.
Ён помніць шведскае «паленне»,
І як гуляў Сувораў тут.
На моры хвалі змылі бераг.
На свеце зніклі гарады
Дуб па-ранейшаму на верас
Увосень сыпле жалуды.

Па паданню пад гэтым дрэвам у час паходу адпачываў рускі палкаводзец А. В. Сувораў. 3 верасня 1794 года адбыўся бой паміж войскамі Суворава і перадавым атрадам паўстанцаў генерала Серакоўскага ля вёскі Дзівін. Пасля бою ў невялікай драўлянай царкве Параскевы Пятніцы ў Дзівіне Аляксандр Сувораў прысутнічаў на падзячным набажэнстве, а затым рушыў далей. У 3-х км ад вёскі атрад спыніўся на адпачынак, і Сувораў прылёг адпачыць пад дубам.

Вялікі, развесісты дуб з шырокай магутнай кронай і сёння стаіць непадалёку ад шашы Дзівін – Кобрын. У дуба - каменная пліта і мемарыяльная дошка, якая нагадвае пра гэты эпізод: «*В 1794 г. во время похода из Немирова к Кобрину под этим дубом отдыхал великий русский полководец Александр Васильевич Суворов»*. Дрэва агароджана, каля яго ўстаноўлены лаўкі, выкапаны калодзеж. Правая частка дуба пашкоджана маланкай.



Леснікі Дзівінскага лясніцтва выкапалі побач глыбокі калодзеж, а дзівінцы гавораць, што вада тут святая і гаючая. І, наогул, Дзівіну пашанцавала, бо ў іх ёсць свой «швейцар». Сапраўды: раптам налятае ветрык, дуб-волат махае галінкай, нібыта запрашаючы спадарожнікаў: рукой падаць – у Дзівін.

Суvoраўскі дуб - помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Гэтае месца заўсёды ўключаюць у турысцкія маршруты.

***Біялагічны заказнік мясцовага значэння «Дзівін - Вялікі Лес»***. Створаны для захавання рэдкіх відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу



Рэспублікі Беларусь. Вялікі лес - назва ўрочышча, якое знаходзіцца непадалёку ад возера Любань. Названы так таму, што на гэтым месцы калісьці быў непраходны лес, які займаў вялікую плошчу. Рэльеф тэрыторыі нізінны, з асобна размешчанымі пясчанымі ўзгоркамі. Тыповымі лясамі, характэрнымі для дадзенай зоны, з’яўляюцца шырокаліставыя - сасновыя. 85% тэрыторыі - лясы, у асноўным з бярозавага і вярбовага дробналесся. Значнае распаўсюджванне на тэрыторыі біялагічнага заказніка «Дзівін - Вялікі Лес» атрымалі таксама дуб, ясень, алешына чорная. У цэлым флора налічае каля 400 відаў сасудзістых раслін. У межах заказніка на плошчы 3,05 тыс. га выяўлены буйнейшыя з вядомых у Беларусі і за яе межамі папуляцый адной з самых рэдкіх архідэй - венерына чаравічка сапраўднага (жоўтага) (каля 10000 экз.). Па прадстаўленасці такога рэдкага для еўрапейскага кантынента выгляду, як венерын чаравічак сапраўдны Cypripedium calceolus (каля 10 тыс.

экзэмпляраў), заказнік «Дзівін - Вялікі Лес» не мае сабе роўных у Рэспубліцы Беларусь. Акрамя таго, на гэтым участку прадстаўлены не меней 12 відаў жывёл і раслін з ахоўных катэгорый Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь. Тэрыторыя ТВП мае вялікае значэнне для захавання рэдкіх відаў птушак. Тут яшчэ захаваліся месцы пасялення вялікага арляца Aquila clanga, вяртлявай чаратоўкі Acrocephalus paludicola, вялікага грычука Limosa limosa. Мясцовая папуляцыя цецерука - адна з самых буйных на крайнім паўднёвым захадзе Беларусі. Увосень перад міграцыяй на меліяраваных землях адзначаюцца зграі шэрых жураўлёў колькасцю да 3000. У цэлым 58 відаў птушак маюць розны Еўрапейскі ахоўны статус. На ТВП адзначана таксам 36 відаў звяроў, 5 відаў рэптылій, 10 відаў амфібій. 165 відаў птушак сустракаюцца на разглядаемай мясцовасці, 130 відаў гняздзіцца.

Асноўныя біятопы: драбналістыя лясы - 35,8%, хваёвыя лясы - 7%, шыракалісцевыя лясы - 5%, сельгасугоддзі - 30%, балоты - 12,5 %, штучныя вадаёмы - 7%, азёры - 2,3%. Даследаванне і абгрунтаванне стварэння заказніка выканана ў рамках праекта «Архідэі Палесся» з фінансавай падтрымкай ISAR.

Нацыянальны прыродаахоўны статус заказніка: цэнтральная частка тэррыторыі з’яўляеца біялагічным заказнікам мясцовага значэння «Дзівін – Вялікі Лес» (3851 га). Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 годзе. На тэрыторыі ТВП «Дзівін - Вялікі Лес» праходзіць сістэма каналаў, якія ўпадаюць у Дняпроўска-Бугскі канал. Самым вялікім з іх з'яўляецца Казацкі канал. Возера Любань, якое звязана дрэнажнымі каналамі з Дняпроўска-Бугскім каналам, з'яўляецца тут адзіным натуральным вадаёмам.

ТВП «Дзівін - Вялікі Лес» выкарыстоўваецца для вядзення лясной гаспадаркі, палявання, рыбалкі, збору грыбоў і ягад. Меліярыраваныя ўчасткі пераважна выкарыстоўваюцца для выпасу кароў і сенакосаў. На берагах возера Любань размешчаны базы адпачынку.



Тэрыторыя заказніка мае вялікае значэнне для захавання месцаў пражывання рэдкіх відаў птушак і з'яўляецца патэнцыяльнай ключавой арніталагічнай тэрыторыяй. Тут водзяцца тры віды птушак, якім пагрэжае знікненне: вялікі падорлік, вяртлявая чаратоўка і бэкас. У пяці відаў колькасць дасягае аднаго і больш працэнтаў нацыянальнай папуляцыі. Мясцовая папуляцыя цецерука - самая буйная на паўднёвым захадзе Беларусі.

# V. Вядомыя людзі, ураджэнцы вёскі Дзівін

Безумоўна, галоўнае дасягненне вёскі - яе жыхары, дзякуючы працавітасці, таленту якіх гэты населены пункт развіваецца. Багаты Дзівін на людзей, якія з’яўляюцца яго гонарам і славай.

**Гардун Сяргей Аляксеевіч** (Сергій Гардун) - святар і вучоны,



прафесар, мітрафорны протаіерэй, кандыдат багаслоўя (1990), дацэнт (2000). Ён злучае ў сваёй асобе навукоўца і клірыка.

Нарадзіўся 4 сакавіка 1959 года ў в. Дзівін. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1976), Маскоўскую духоўную семінарыю (1986). Працаваў настаўнікам Маскоўскай духоўнай семінарыі. З 1989 года С. А. Гардун працуе ў Мінскай духоўнай семінарыі. Дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, дацэнт кафедры багаслоўскіх дысцыплін факультэта тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. З 2005 года – загадчык кафедры бібліістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прафесіянал як у галіне багаслоўскай падрыхтоўкі, так і ў сферы мовазнаўства. Валодае дзевяццю мовамі, у тым ліку грэчаскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, англійскай, французскай, польскай, украінскай.

Узнагароджаны ордэнамі Сергія Раданежскага III ступені, Кірылы Тураўскага I і II ступеней, медалём Сергія Раданежскага II ступені і іншымі царкоўнымі ўзнагародамі. Кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла дакументальны фільм «Айцец Сергій» (2007; сцэнарый У. В. Мароза, пастаноўка рэжысёра С. А. Гайдука) аб лёсе чалавека, які прысвяціў свае жыццё служэнню Богу, – протаіерэя Сергія Гардуна.

**Драмук Сцяпан Іванавіч** – самадзейны мастак-пейзажыст,



дыпламант рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаў, лаўрэат Другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці, узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ.

Сцяпан Іванавіч - з таго пакалення, чыё маленства было апалена вайной. Нарадзіўся 5 мая 1932 года ў в. Дзівін, быў адным з першых

выпускнікоў мясцовай школы. У 1952 годзе паступіў у горны тэхнікум у Данецкай вобласці. Пасля заканчэння тэхнікума працаваў на шахтах Данбаса горным майстрам, начальнікам участка аддзела капітальных работ. У 1966 годзе пераехаў у родную Беларусь, у Гомель. У Гомеле да выходу на пенсію працаваў на заводзе трактарных пускавых рухавікоў.

Маляваць пачаў з дзяцінства. Першыя работы Сцяпан Драмук прадставіў на абласной выставе ў Брэсце ў 1950 годзе, калі яшчэ быў вучнем. Пазней яго малюнкі выстаўляліся на абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных выставах. З 1966 года С. Драмук з'яўляецца дыпламантам рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаў. Работы Сцяпана Іванавіча бачылі ва ўсіх былых сацыялістычных рэспубліках, а таксама ў Югаславіі, Францыі. Неаднаразова С. Драмук рабіў свае юбілейныя выставы ў г. Гомеле і ў Дзівіне.



Сцяпан Іванавіч малюе сціплыя, але непаўторныя беларускія краявіды. Калі сабраць усе разам карціны мастака, атрымаецца цэлая карцінная галерэя. **«**Не бачу свайго жыцця без фарбаў,- дзеліцца С. І. Драмук сваімі думкамі, - бяруся за фарбы - і лягчэй робіцца на душы». Пейзажы мастака пранізаны замілаваннем прыроды, ад яго палотнаў ідзе энергія дабрыні, пакою, цішыні.

У апошнія гады Сцяпан Іванавіч жыве ў Гомелі, але, калі ён прыязджае на радзіму ў Дзівін, то заўсёды знаходзіць час зайсці ў родную школу, наладзіць выставы сваіх карцін у роднай вёсцы.

**Знахарчук Мікалай Васільевіч** – афіцэр-падводнік - загінуў пры выкананні службовых абавязкаў.



Нарадзіўся 22 кастрычніка 1947 года ў в. Дзівін. Па ўспамінах родных і знаёмых, Мікалай быў вясёлым хлопцам, не цураўся ніякай работы і з задавальненнем дапамагаў бацькам па гаспадарцы. А яшчэ ён вельмі любіў чытаць, асабліва кнігі пра мора. Таму пасля заканчэння сярэдняй школы Мікалай Знахарчук стаў курсантам Севастопальскага вышэйшага ваенна-марскога вучылішча. Па размеркаванні трапіў на Паўночны флот у 1-ю флатылію атамных падводных лодак.

Геройскі загінуў у 1976 годзе. З 24 на 25 верасня ў час пахода на лодцы пачаўся пажар у электратэхнічным адсеку. Цаной асабістага жыцця тры капітаны, у т.л. і Мікалай Знахарчук, ліквідавалі пажар і яго наступствы.

Толькі праз 24 гады з кнігі «Рабочая глыбіня» адмірала А. П. Міхайлоўскага сталі вядомы імёны і прозвішчы трох герояў, якія цаною свайго жыцця выратавалі падводную лодку і яе экіпаж. Ратуючы судна, яны свядома ішлі на смерць. Сярод герояў значыўся і Мікалай Знахарчук.

У Дзівін прыязджаў саслужывец М. Знахарчука капітан 1-га рангу А. К. Стасёнак. Менавіта ён на руках выносіў з падводнай лодкі загінуўшых. Анатоль Кузьміч расказаў родным і землякам Мікалая аб хадайніцтве перад урадам Расіі аб прысваенні капітан-лейтэнанту Знахарчуку Мікалаю Васільевічу звання героя Расіі.

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** - беларускі і ўкраінскі палітычны дзеяч, дыпламат, ганаровы грама-дзянін г. Еўпаторыі.



Нарадзіўся 8 мая 1939 года. У Дзівінскую сярэднюю школу пайшоў у шэсць гадоў у далёкім пасляваенным 1945 годзе. Пасля заканчэння ў 1955 годзе школы паехаў у Данбас. У 1957 годзе закончыў тэхнічнае вучылішча ў г. Чырвоны Прамень Луганскай вобласці. Пасля заканчэння ў 1960 годзе Тарэзскага горнага тэхнікума (Данецкая вобласць, Украіна) працаваў машыністам, горным майстрам самай глыбокай шахты Данбаса «Качагарка», тэхнолагам, галоўным тэхнолагам завода высака-вольтнай апаратуры ў г. Канстанцінаўка. Шэсць гадоў аддаў шахцёрскай працы. Узнагароджаны ордэнамі Шахцёрскай Славы II і III ступеняў.

Закончыў завочна Украінскі політэхнічны інстытут (1967). Пасля завода - на партыйнай рабоце. У 1974-1982 гадах - другі, першы сакратар Канстанцінаўскага гаркама. З 1982 года жыве ў Крыме, які для Віталія Уладзіміравіча стаў другой радзімай. У 1982-1985 гадах ён быў старшынёй гарвыканкама ў г. Еўпаторыі, потым плённа працаваў у Крымскім абкаме партыі. У 1985-1987 гадах В. У. Курашык - загадчык аддзела Крымскага абкама КПУ, у 1987-1991 гадах - намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня Крымскага аблвыканкама. У 1991-1993 гадах В. У. Курашык - старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Крым. З мая 1993 па 14 чэрвеня 2001 года - Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне. З 1999 года - дуайен дыпкорпуса. З 2003 года - саветнік Прадстаўніка Прэзідэнта ААТ «Лукойл» на Украіне.

Сёння ён знаходзіцца на пенсіі. Жыве ў вядомым крымскім горадзе Еўпаторыі, піша кнігі. У 2010 годзе выйшла яго кніга «Я не хочу судьбу

иную…(Записки дипломата)», у якой шмат старонак прысвечана малой радзіме – в. Дзівін.

**Лазоўская Тамара Іванаўна** нарадзілася ў в. Дзівін. Тут яна



атрымала карані свайго музычнага таленту. З ранняга дзяцінства спявала дуэтам са сваёй маці Кацярынай Ульянаўнай, якая дала ёй прыродны дар спеваў і любоў да песні, музыкі, мастацтва. У гады вучобы ў Дзівінскай сярэдняй школе Тамара ўдзельнічала ў школьным хоры і ансамблі. У 1975 годзе скончыла школу і ў 1976 годзе паступіла ў Брэсцкае музычнае вучылішча на вакальнае аддзяленне. Працавала сакратаром у адной з брэсцкіх школ, спявала ў хоры настаўнікаў, потым у вакальным гуртку пры клубе работнікаў бытавога абслугоўвання. У 1979 годзе ўдзельнічала ў рэспубліканскім конкурсе вакалістаў музычных вучылішчаў, які праходзіў у г. Ліда, і стала дыпламантам, а таксама была адзначана прызам за лепшае выкананне твораў кампазітара Шапэна. У 1980 годзе закончыла музычнае вучылішча, і яе запрасілі ў Мінскі тэатр оперы і балета. На працягу года засвоіла ўвесь рэпертуар опернага тэатра і ў 1982 годзе атрымала галоўную ролю ў спектаклях А. Уладзімірава «Воўк і сямёра казлянят», П. І. Чайкоўскага «Пікавая дама», К. Афенбаха «Казкі Гофмана». Оперы ў тэатры выконваліся на 6 мовах: беларускай, рускай, латыні, італьянскай, французскай, нямецкай. З гастролямі Т. І. Лазоўская пабывала ў шматлікіх гарадах Савецкага Саюза і за яго межамі: Геаграфію канцэртаў тэатра складаюць такія краіны, як Польшча, Германія, Іспанія, Партугалія, Ізраіль, Таіланд і інш.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** – беларускі дзеяч самадзейнага



мастацтва, кампазітар, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі (1978).

Нарадзіўся 2 мая 1940 года ў в. Дзівін. У сям'і ўсе любілі музыку, бацька і маці, двое старэйшых братоў і сястра спявалі і ігралі на народных інструментах. З шасці гадоў Сяргей засвоіў гармонік, пазней – акардэон, удзельнічаў у розных канцэртах, аглядах мастацкай самадзейнасці раёна і вобласці. Вучыўся ў Дзівінскай сярэдняй школе (1946–1956). Збіраўся атрымаць прафесію лётчыка, нават падаў заяву ў вучылішча грамадзянскай авіяцыі. Але зразумеў, што галоўнае для яго – музыка, і самавукам, без падрыхтоўкі ў дзіцячай музычнай школе, паступіў у Брэсцкае

музычнае вучылішча. Скончыўшы вучылішча ў 1960 годзе, Сяргей Любчук паступіў у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. Тут у яго адкрыліся новыя таленты – стаў пісаць музыку, вершы. З 1960 года - выкладчык, кіраўнік аркестра сярэдняй школы № 34 г. Мінска, саліст-баяніст Беларускага тэлебачання і радыё. З 1965 года - у Брэсце: кіраўнік аркестра народных інструментаў і выкладчык музычнага вучылішча, кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Брастчанка» электрамеханічнага завода (1970-1980), з 1981 года - мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Бярэсце» Палаца культуры абласнога савета прафсаюзаў. Адначасова з 1995 года С. Ф. Любчук з’яўляецца мастацкім кіраўніком народнай харавой групы «Красуні» ААТ «Прадтавары» (Брэст).

С. Ф. Любчук – аўтар фантазіі на тэмы беларускіх народных песень для баяна з аркестрам народных інструментаў, рамансаў, музыкі да спектакляў Брэсцкага тэатра лялек, апрацовак і перакладаў для аркестра народных інструментаў і народных хораў. Піша песні, якія ўвайшлі ў рэпертуар брэсцкіх ансамбляў і калектываў рэспублікі. Шэраг твораў кампазітар прысвяціў Брэсту, роднаму Дзівіну («Дзівін, каханы, зямля мая любая» (словы Н. Піваваравай). Выдадзены зборнікі аўтарскіх песень С. Ф. Любчука «Любы мой край» (1996; 2000), «Горад мой, Бярэсце. Добры дзень, людзі!» (2015), аўдыядыск «Песни Сергея Любчука» (2009). 2 мая 2010 года ў Брэсцкім палацы культуры прафсаюзаў прайшоў творчы вечар Сяргея Феадосавіча, прымеркаваны да яго 70-годдзя.

**Піваварава Юлія Віктараўна** - незвычайна таленавіты чалавек: піша вершы, музыку для ўласных песен, майстар па саломапляценню. Дыпламантка розных конкурсаў.



Нарадзілася ў 1974 годзе ў в. Дзівін. У 11 лет напісала свой першы верш. У 1991 годзе скончыла школу, а праз год паступіла ў Кобрынскае вучылішча народных мастацкіх промыслаў. У 1993 годзе атрымала спецыяльнасць «Інструктар саломкай». Пайшла працаваць кіраўніком гуртка «Інкрустацыя і пляценне саломкай» у родную школу, а таксама ў школу-інтэрнат.

У 1994 годзе паступіла ў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна на факультэт беларускай філалогіі, атрымала спецыяльнасць настаўніка беларускай мовы і літаратуры.

У 1992 годзе ўпершыню быў надрукаваны верш Юліі Піваваравай у газеце «Кобрынскі веснік». З таго часу яе вершы, апавяданні, артыкулы аб жыцці землякоў рэгулярна з'яўляюцца на старонках раённай газеты.

Друкавалася ў зборніках «Ад Буга да Наддзвіння», «Песнярам Беларусі». У 2002 годзе стала пераможцай рэспубліканскага літаратурнага конкурсу маладых талентаў.

Акрамя сваёй літаратурнай творчасці яна радуе людзей вырабамі з саломы. Ю. Піваварава прымала ўдзел у І Міжнародным фестывалі па саламянаму мастацтву. Са сваімі вырабамі Юлія пабывала нават у Венесуэле. Яе работы знаходзяцца ў Брэсцкім грамадска-культурным цэнтры. У 2003 годзе Ю. Піваварава прынята ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці. Яна перадае сваё майстэрства дзецям, праводзіць майстар-класы для працаўнікоў культуры.

**Самерсава Надзея Уладзіміраўна** – прафесар, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.



Нарадзілася 17 ліпеня 1961 года ў вёсцы Дзівін. Пасля заканчэння Дзівінскай сярэдняй школы паступіла ў Мінскі дзяржаўны інстытут культуры (цяпер - Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). Інстытут закончыла з чырвоным дыпломам, была размеркавана ў сталічны Дом народнай творчасці.

Паспяховы ўдзел у конкурсе на замяшчэнне вакантнай пасады выкладчыка інстытута культуры дазволіў вярнуцца ў інстытут ужо ў якасці педагога. Надзею Уладзіміраўну заўсёды захапляла навука, таму ў яе метадычнай скарбонцы навукова-метадычныя дапаможнікі, навуковыя манаграфіі, навучальныя праграмы, больш за 300 артыкулаў.

Тэма дысертацыйнага даследавання - «Аптымізацыя экалагічнай адукацыі і выхавання падлеткаў ва ўстановах сацыякультурнай сферы». Надзея Уладзіміраўна Самерсава мае больш за 40 навуковых і навукова-метадычных публікацый. Прымае ўдзел у адукацыйных і сацыяльна-экалагічных праектах, мае сертыфікаты міжнароднага ўзору па трэнерскай працы. Кіраўнік пастаянна дзеючага семінара «Экалагічная адукацыя для ўстойлівага развіцця» (Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр).

Сёння Надзея Уладзіміраўна – намеснік загадчыка кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** - кандыдат багасловя.



Нарадзіўся ў 1938 годзе ў в. Дзівін Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна). Бацькі Фёдар Сільвестравіч і Ганна Сцяпанаўна назвалі яго Аляксандрам у гонар рускага князя Аляксандра Неўскага. Дзяцінства хлопчыка праходзіла ў нялёгкі час. На ўсё жыццё ў памяці Аляксандра засталіся ўспаміны пра тое, як іх сям'і прыходзілася галадаць, хавацца ў лесе ад немцаў. Але прыйшла доўгачаканая перамога, і Саша ідзе ў першы клас сельскай школы. У 1956 годзе ён закончыў Дзівінскую школу.

У 1956 годзе Аляксандр становіцца студэнтам Мінскай духоўнай семінарыі. Валодаючы выдатным музычным слыхам і моцным прыродным голасам, ужо ў першы год навучання студэнт Свідуновіч звяртае на сябе ўвагу выкладчыка царкоўных спеваў, і яго прызначаюць рэгентам царкоўнага хору. У Ленінградскую духоўную акадэмію яго залічваюць без уступных экзаменаў. Закончыў акадэмію Аляксандр Свідуновіч ў 1964 годзе са ступенню кандыдата багасловя.

Служыў у Смаленску, Днепрапятроўску. З 1988 года Аляксандр Свідуновіч - настаяцель Свята-Мікалаеўскага сабора, благачынны цэркваў г. Днепрадзяржынска. Царкоўны працоўны стаж першага настаяцеля Свята-Мікалаеўскага сабора складае 52 гады, за час якога яго заслугі былі адзначаны мноствам царкоўных і дзяржаўных узнагарод. 8 снежня 2008 года Аляксандр Фёдаравіч памёр, але памяццю пра яго застаўся адроджаны ім Свята-Мікалаеўскі сабор, на тэрыторыі якога і пахаваны мітрафорны протаіерэй айцец Аляксандр Свідуновіч.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** – вучоны ў галіне металургіі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (2015), акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША).



Нарадзіўся 29 красавіка 1940 года ў вёсцы Дзівін у сям’і работнікаў гандлю. Закончыўшы дзесяць класаў Дзівінскай школы, хацеў паступаць у ваенна-марское вучылішча, але па парадзе ўрача-афтальмолага адмовіўся ад ваеннай прафесіі, паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут на спецыяльнасць «Машыны і тэхналогіі ліцейных вырабаў».

У гады вучобы на другім курсе пачаў займацца навукова-даследчай дзейнасцю. Пасля заканчэння інстытута ў 1962 годзе Мікалай Свідуновіч працаваў інжынерам на Мінскім трактарным заводзе. У 1964–1967 гадах вучыўся ў аспірантуры пры БПІ. У 1967 годзе М. Свідуновіч абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1980 годзе - доктарскую дысертацыю. З 1968 года працуе ў Беларускім тэхналагічным інстытуце імя С. Кірава (з 1993 года Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт): асістэнт, дацэнт, намеснік дэкана. З 1980 года – загадчык кафедры матэрыялазнаўства і тэхналогіі металаў, з 2007 года – прафесар гэтай кафедры. Чытаў лекцыі ў вядучых універсітэтах свету ў ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі і іншых краінах. Падрыхтаваў 15 кандыдатаў навук. У 1996 годзе абраны сапраўдным членам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Аўтар 15 замежных патэнтаў, у тым ліку такіх краін, як ЗША, Японія, ФРГ, Італія, Швецыя, Вялікабрытанія, 60 аўтарскіх пасведчанняў СССР, 200 апублікаваных прац, з іх 2 манаграфій. Сумесна з беларускім навукоўцам у вобласці распрацоўкі новых матэрыялаў, тэхналогій і машынабудавання, акадэмікам НАН Беларусі, прафесарам П. А. Віцязем ім упершыню ў Рэспубліцы Беларусь выдадзены вучэбны дапаможнік «Основы нанотехнологий и наноматериалов».

М. А. Свідуновіч – прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША), член Савета фонда фундаментальных даследаванняў Рэспублікі Беларусь, старшыня секцыі Савета НАН Беларусі. Узнагароджаны медалём СССР «За працоўную доблесць» (1979), граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР (1980), Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2000), Сусветным медалём Свабоды (The World Medal of Freedom) Амерыканскага біяграфічнага інстытута (2006).

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч** – педагог, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык цэнтра гісторыі новай і навейшай гісторыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.



Нарадзіўся 18 студзеня 1952 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна ў вялікай сялянскай сям'і. У цяжкія пасляваенныя гады атрымаць добрую адукацыю было вельмі складана. І таму для вясковага хлопчыка, якога з дзяцінства вабілі кнігі, накіраванне ў 1959 годзе на вучобу ў Дзівінскую школу-

інтэрнат было сапраўдным шчасцем. Да 9 класа Мікалай ужо дакладна вызначыўся з будучай прафесіяй: ён марыў быць гісторыкам.

У 1970 годзе паступіў вучыцца ў Мінскі педагагічны інстытут. Атрымаўшы дыплом з адзнакай (1974), малады спецыяліст з 1974 па 1978 год працаваў у Пухавіцкім раёне дырэктарам Слабадской няпоўнай сярэдняй школы. Пасля заканчэння службы ў арміі з лістапада 1979 года Мікалай Уладзіміравіч - настаўнік гісторыі 116-й сярэдняй школы г. Мінска.

У 1980 годзе М. Смяховіч выбраны адказным сакратаром Фрунзенскай раённай арганізацыі Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР. На гэтай пасадзе шмат часу надаваў вывучэнню літаратуры, у першую чаргу гістарычнай. У 1985 годзе перайшоў на працу ў Мінскі кааператыўны тэхнікум, дзе выкладаў грамадскія дысцыпліны. З 1987 года М. Смяховіч працаваў на розных пасадах у БДПУ імя М. Танка.

Кандыдат гістарычных навук (1992), дацэнт (1995). Міхаіл Смяховіч плённа спалучаў выкладчыцкую і навуковую дзейнасць і ў верасні 1997 года за шэраг навуковых прац па гісторыі Беларусі стаў лаўрэатам прэміі БДПУ імя М. Танка. У 2002 годзе ён перайшоў на выкладчыцкую работу ў Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва. З верасня 2005 года Мікалай Уладзіміравіч працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, дзе ўзначаліў аддзел гісторыі беларускай дзяржаўнасці, у 2006 годзе - цэнтр гісторыі індустрыяльнага грамадства. Са студзеня 2016 года - загадчык цэнтрам новай і найноўшай гісторыі Беларусі.

Мікалай Уладзіміравіч Смяховіч папоўніў скарбонку беларускай гістарыяграфіі цікавымі арыгінальнымі даследаваннямі, што атрымалі прызнанне як у рэспубліцы, так і па-за яе межамі. Ён з'яўляецца аўтарам больш як 100 навуковых публікацый, якія прысвечаны вывучэнню актуальных праблем айчыннай гісторыі і метадалогіі гісторыі, у тым ліку адной індывідуальнай работы і пяці калектыўных манаграфій.

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** – вучоны-фізіёлаг, кандыдат біялагічных навук, дацэнт.



Нарадзіўся Аляксандр Сінкавец 4 красавіка 1973 года ў вёсцы Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 годзе закончыў з залатым медалём Дзівінскую сярэднюю школу. Паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут.

У 1995 годзе закончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны (ВДАВМ) па спецыяльнасці «Ветэрынарыя». З лістапада 1995 года па лістапад 1998 года Аляксандр Уладзіміравіч -

аспірант кафедры нармальнай і паталагічнай фізіялогіі. У красавіку 1999 года абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук. У 2000 годзе назначаны на пасаду дацэнта кафедры нармальнай і паталагічнай фізіялогіі ВДАВМ.

Апублікавана 22 навуковыя працы, у тым ліку 7 вучэбна-метадычных. Па тэме навуковых даследаванняў у 1997 годзе Аляксандр Уладзіміравіч атрымаў патэнт на вынаходніцтва, а ў 1999 годзе зацверджаны абласныя рэкамендацыі. А. У. Сінкавец з'яўляецца суаўтарам вучэбных дапаможнікаў: «Асновы фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл», «Практыкум па фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл», «Вучэбная праграма па фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл для вышэйшых сельскагаспадарчых вучэбных установ». Праводзіў навуковыя даследаванні па тэме «Рэзістэнтнасць і мінеральны абмен у птушак».

Сёння А. У. Сінкавец з’яўляецца кіраўніком вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскі завод ветэрынарных прэпаратаў».

**Усенка Вера Антонаўна** - самадзейная мастачка, чалавек рэдкай мужнасці, сілы духу, удзельніца і лаўрэат рэспубліканскага фестывалю творчасці.



Вера Нарадзілася шостым дзіцём у сям’і ў 1942 годзе ў в. Дзівін. Цяжкая хвароба з пяці гадоў абмежавала яе магчымасці і прыкавалі да ложка. Ва ўсіх жыццёвых акалічнасцях Веру падтрымлівала захапленне жывапісам.

Першая персанальная выстава Веры Усенка «Люди моей деревни» прайшла ў Кобрыне ў 1984 годзе. З 1992 года работы дзівінскай мастачкі выстаўляюцца ў г. Брэсце. З апошніх – «Живи и радуйся» - у 2015 годзе ў Брэсце.

У 1997 годзе В. Усенка стала лаўрэатам рэспубліканскай выставы народнай творчасці інвалідаў.

Піша пейзажы роднага краю, партрэты блізкіх і знаёмых, карціны на біблейскія тэмы. Свае карціны мастачка піша ў асноўным для выстаў, прадаваць іх шкадуе, бо кожная карціна выпакутавана і асабліва дарагая для яе.

# VI. Сучасны Дзівін

Дзіваншчына дарагая!
Як шчыра мы любім цябе!
Другой мы такой не шукаем,
Дык пэўна не знойдзем нідзе.
З табой нарадзілася змалку
І рады тваёй мы красе.
Радзіма! Зямля дарагая!
Табой захапляемся ўсе.

*Ю. Півакарава*

Прывабны выгляд мае сучасны Дзівін. На пачатак 2016 года колькасць насельніцтва вёскі склала 3162 жыхары.



У 2008 годзе вёска стала аграгарадком. У межах ажыццяў-



лення Дзяржаўнай праграмы развіцця і адраджэння сяла створана неабходная сацыяльна-бытавая інфраструктура - функцыянуюць аддзяленне



сувязі, аддзяленне ААБ «Беларусбанк», Цэнтр культуры і дасуга, Дом рамёстваў, школа мастацтваў, некалькі бібліятэк, сярэдняя школа, дзіцячы дом, дзіцячы сад, аптэка, баня, аддзяленне Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Сяльчанам аказваецца комплексная медыцынская дапамога ў Дзівінскай участковай бальніцы. Адрамантаваны і прыведзены ў належны стан новыя сеткі водазабеспячэння, пабудавана сетка газазабеспячэння. Развіваецца гандаль: ніколі не пустуе магазін Кобрынскага райспажыў-

таварыства «Родны кут», прыватныя магазіны, функцыянуюць магазіны кампаніі «Нашы вытокі», кафэ.

Пабудаваны цэлыя мікрараёны. У Дзівіне размешчана пагранічная застава.

У вёсцы працуе шмат установаў, прадпрыемстваў.

Вядучая роля ў Дзівіне належыць ***ААТ «Любань***». Арганізавана ў 2003 годзе на базе калгасаў «Новае жыццё» і «Чырвоная зорка». Цэнтральная сядзіба знаходзіцца ў в. Дзівін. На сучасным этапе ў ААТ «Любань» (ААТ з 2015 года) налічваецца каля 200 работнікаў. Агульная зямельная плошча складае 7341 га, сельгасугоддзямі заняты 5221 га. Спецыялізіруецца на вытворчасці прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі. Актыўна развіваюцца мясамалочны напрамак і раслінаводства. Асноўныя галіны раслінаводства: зернавыя культуры (жыта, пшаніца, ячмень, авёс), бульба. Асноўныя галіны жывёлагадоўлі: малако, ялавічына. У гаспадарцы функцыянуе сучасны жывёлагадоўчы комплекс.

«Лес у нас паўсюль», - кажуць дзівінцы. Плошча ***Дзівінскага лясніцтва Кобрынскага лясгаса*** складае 14014 гектараў. Год заснавання – 1949. На тэрыторыі лясніцтва большую частку займаюць сасновыя насаджэнні. Кожны год лясніцтвам высякаецца 2600 кубаметраў лесу, нарыхтоўваецца драўніна, якая ідзе на экспарт. Яловая драўніна адпраўляецца ў цэх перапрацоўкі, дровы рэалізуюцца насельніцтву. Вядзецца пасадка маладых саджанцаў на плошчы 25 га. Лясніцтва мае сваю пажарную каманду. Працуюць егеры, якія ахоўваюць жывёл ад браканьераў, а зімой падкармліваюць дзікіх жывёл. У лесе сустракаюцца такія жывёлы, як дзікі кабан, лось, воўк, ліса, касуля, заяц, вавёрка і інш. Расце каля 29 відаў грыбоў. У мясцовым міні-дэндрапарку прырастаюцца нават такія экзатычныя расліны, як самшыт, фарзіцыя, гартэнзія, вялікае мноства відаў дрэў і хмызнякоў. З году ў год Дзівінскае лясніцтва займае прызавыя месцы на конкурсах, у тым ліку і за добраўпарадкаванне тэрыторыі.





***Дзівінскі цэх па перапрацоўцы драўніны Кобрынскага лясгаса.*** Год заснавання - 1949. Ранейшая назва - Дзівінская мехустаноўка. Самастойна прадпрыемства існуе з 1984 года. У структуры прадпрыемства - цэх па перапрацоўцы дробнатаварнай драўніны; тарны цэх; лесапільны цэх. Сярод прадукцыі, якая выпрацоўваецца: абрэзныя і неабрэзныя піламатэрыялы, шчыты для агароджы, штахетнік, абшыўка і інш. Асаблівым попытам карыстаюцца розныя віды дошак, точаныя вырабы. Алешына чорная - асноўная сыравіна ў цэху ўжо каля 10 гадоў. З тых часоў Дзівінскі цэх - лідар па аб'ёмах пілавання гэтай сыравіны ў Беларусі. Значная частка ўсёй прадукцыі адпраўляецца на экспарт.



Выдатная якасць вырабаў, надзейнасць партнёраў стварылі добры імідж дзівінскім майстрам, пашырылі геаграфію збыту прадукцыі. Цяпер Дзівін ведаюць у многіх краінах Еўропы: Польшчы, Германіі, Галандыі, Бельгіі, Францыі, Аўстрыі, Даніі, Англіі, Прыбалтыцы. Калектыў Дзівінскага цэха лясгаса забяспечвае экспартныя пастаўкі і заказы айчынных і расійскіх спажыўцоў, якія пастаянна ўзрастаюць.

Цэх па перапрацоўцы драўніны ў вёсцы Дзівін лічыцца адным з лепшых прадпрыемстваў падобнага тыпу ў Брэсцкай вобласці. Уся вытворчасць размешчана на плошчы 8,52 га. За мінулы час у цэху неаднаразова змянялася абсталяванне, але найбольш сур'ёзная мадэрнізацыя зроблена ў апошнія гады. Гэта дазволіла павялічыць не толькі аб'ёмы, але і асартымент.

***Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лангхайнрых Канфекцыён Бел»***, размешчанае ў Дзівіне, - паспяховы прыклад замежных інвестыцый у эканоміку нашай краіны. Створана ў рэканструіраваным будынку былога швейнага участка ў 2005 годзе. Гэта філіял фабрыкі па вытворчасці сталовай і пасцельнай бялізны нямецкага горада Шлітц. Схема простая: з Германіі паступаюць тканіны, у Германію - гатовыя швейныя вырабы, якія потым разыходзяцца практычна па ўсім свеце.



Пасцельная бялізна, сурвэткі, абрусы і шматлікія іншыя тавары, выпрабленыя прадпрыемствам, нязменна карыстаюцца попытам, асабліва ў сферы гасцінічнага бізнэсу. Фірма пастаўляе на рынак прадукцыю высокай якасці. Стабільная праца прадпрыемства дазваляе вырашыць як праблемы занятасці жыхароў Дзівіна, так і забеспячэння дастойнага ўзроўню арганізацыі працы і адпачынку калектыва.



Нягледзячы на даволі малады ўзрост, за пасляховую працу прадпрыемства ўжо было адзначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, неаднаразова станавілася пераможцам конкурсаў «Лепшы прадпрымальнік Брэсцкай вобласці» і «Лепшы прадпрымальнік Кобрынскага раёна». Працуюць на прадпрыемстве 150 чалавек, з іх большасць - мясцовае насельніцтва.

***Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Дзівінская хлебапякарня***»




Год заснавання - 1962. Больш за 70 тон хлебабулачных вырабаў выпякаюць за год старанныя рукі працаўнікоў Дзівінскай хлебапякарні. У дзівінскім хлебе хіміі не знойдзеш. Усё натуральнае, адпаведна старажытным рэцэптам, па якіх выпякалі хлеб нашы продкі. Таму і водар прыемны, і смак такі, што не забываецца. Дарэчы, яшчэ адна асаблівасць вытворчасці дзівінскіх хлебапёкаў - практычна ўсе аперацыі тут выконваюцца ўручную. Можа, у гэтым і сакрэт выдатнага смаку? Няма сумненняў, механізацыя дае шмат пераваг, але супрацоўнікі пякарні (а іх тут працуе 30 чалавек) прытрымліваюцца прынцыпу «Хлеб патрабуе не толькі працы, але і

душы». З душой і любоўю да сваёй справы працуюць хлебапёкі Дзівінскай пякарні. І розныя прысмакі выходзяць з-пад іх цёплых жаночых рук такімі, што толькі пальчыкі абліжаш.

Не дзіўна, калі на рынку ў Кобрыне з'яўляецца аўтафургон з дзівінскімі хлебабулачнымі вырабамі, тут адразу ўтвараецца чарга. Гандаль ідзе хутка і бесперапынна.

Прадпрыемства існуе вось ужо каля 55 гадоў, і ўвесь гэты час, нягледзячы на складанасць работы ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, радуе спажыўцоў нязменна выдатнай якасцю - хлеб у Дзівіне пячы ўмелі заўсёды. Вось і сёння тут выпускаецца  шмат яго найменняў - ад звычных усім «кірпічыкаў» і батонаў да разнастайных пірагоў, рулетаў і іншых прысмакаў.

За пяцьдзесят з лішнім гадоў удалося значна ўдасканаліць вытворчасць. Пасля таго, як была ўстаноўлена ратацыйная печ, асартымент булачных вырабаў пашырыўся да 25 найменняў. У апошнія гады праведзены рамонт бытавых пакояў, душавых, упарадкавана тэрыторыя прадпрыемства. Сёння хлебапякарня пастаўляе сваю прадукцыю больш чым у 80 гандлёвых кропак. Прадпрыемства працягвае працаваць стабільна.

***Дзівінская сельская ўчастковая бальніца.*** Будаўніцтва новай участковай бальніцы ў Дзівіне пачалося ў канцы 80-х гадоў. А неабходнасць такая наспела яшчэ раней: лячэбная ўстанова, якая адлічвала сваю гісторыю з 1940 года, тулілася ў даўно аджыўшых сваё памяшканнях. Нягледзячы на цяжкасці перабудовачнага перыяду, Дзівінская ўчастковая бальніца была здадзена «пад ключ» у 1996 годзе і абсталявана ўсім неабходным для лячэння пацыентаў. Стацыянарнае лячэнне насельніцтва пры адкрыцці было разлічана на 100 ложкаў.




У зону абслугоўвання бальніцы ўваходзіць з дзясятак вёсак з насельніцтвам каля 10 тысяч чалавек. У ведамстве бальніцы знаходзяцца тры фельдшарска-акушэрскіх пункты (Лелікаўскі, Осаўскі, Хабовіцкі).

У стацыянары бальніцы дзейнічае два аддзяленні: тэрапеўтычнае на 35 і аддзяленне сястрынскага дагляду на 25 коек. У амбулаторыі прыём вядуць тэрапеўты, педыятры, гінеколаг, неўролаг, зубны лекар. Працуюць працэдурны, фізіятэрапеўтычны і рэнтген-кабінеты, кабінет УЗІ і функцыянальнай дыягностыкі.

***Дзіцяцы дом*** (раней - агульнаадукацыйная школа-інтэрнат) заснаваны ў 1959 годзе па загаду Савета Міністраў Беларусі пасля рэарганізацыі Дзівінскага раёна.



5 сакавіка 1960 года ў школу прыбылі першыя 20 выхаванцаў. З таго часу гэты дзень лічыцца днём нараджэння школы, які адзначаецца штогод.

З 1 верасня 1997 года школа пераўтворана ў школу для дзяцей-сірот. За гады існавання школы выпрацаваны свае правілы і традыцыі, якія падтрымліваюцца работнікамі і выпускнікамі школы. У 2004 годзе быў пабудаваны новы спальны корпус на 102 чалавекі, які злучаны з вучэбнымі кабінетамі цёплым пераходам.

1 верасня 2009 года УА «Дзівінская дзяржаўная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў» была перайменавана ў ДУА «Дзівінскі дзіцячы дом». Сучасная блочная сістэма дазваляе стварыць дамашнюю атмасферу.

На сённяшні дзень у школе 59 выхаванцаў ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў. Умовы пражывання максімальна набліжаныя да дамашніх: утульныя спальні (у пакоі па 2 чал.); гасцявыя пакоі, дзе ёсць мяккія канапы, тэлевізары, DVD, камп’ютары; пакоі для выканання ўрокаў; іншыя гаспадарчыя пабудовы, якія забяспечваюць нармальны рэжым працы.



Ткацтва, вышыўка, пляценне паясоў, саломка - гэта і шматлікае іншае з традыцый продкаў сёння адраджаецца і знаходзіць новае жыццё ў ***Дзівінскім Доме рамёстваў.***



Дом рамёстваў быў створаны на базе Дзівінскай школы народнай творчасці 1 снежня 2008 года. Прызначэнне ўстановы арганізатары бачылі ў адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю. З гэтай мэтай тут займаюцца зборам і апрацоўкай этнаграфічных матэрыялаў, захоўваюць і развіваюць традыцыйныя рамёствы. Жамчужынкай установы з’яўляецца невялікі музей, дзе сабраны ўзоры мясцовага ткацтва, вышыўкі, роспісу па дрэве і шкле. Сярод экспанатаў – святочная і штодзённая мужчынская і жаночая вопратка. У этнаграфічным кутку шырока прадстаўлены прадметы сялянскага быту. У зборы экспанатаў актыўнасць праяўляюць не толькі супрацоўнікі Дома рамёстваў, але і жыхары Дзівіна і наваколля.



Акрамя ткацтва пры ўстанове дзейнічаюць гурткі па саломапляценні, пляценні паясоў, вышыўцы і роспісе па дрэве, у якіх займаюцца больш за 30 выхаванцаў. Пры Доме рамёстваў створаны фальклорны калектыў. Некалькі разоў з канцэртнымі праграмамі выязджалі за мяжу, у Польшчу.

Дом рамёстваў вядомы не толькі ў раёне, дзе з’яўляецца адзінай установай такога статусу, але і за яго межамі. Тут ствараецца сувенірная прадукцыя. Дзівінчане актыўна і паспяхова вядуць выставачную работу. Штогод яны ўдзельнічаюць у свяце горада і ў раённым свяце традыцыйнай культуры «Золата палёў». Нягледзячы на даволі малады ўзрост, Дом рамёстваў ужо паспеў зарэкамендаваць сябе з найлепшага боку на выставах у Белавежскай пушчы, у Мінску, у Польшчы, на рэспубліканскім кірмашу працаўнікоў сяла «Дажынкі-2009».

***Возера Любань***

Жамчужынай сяла з'яўляецца возера Любань. Як сцвярджае паданне, назва возера Любань паходзіць ад слова «люба», г.зн. міла, прыгожа. Па



другой версіі - ад жаночага імя Люба (Любоў).

Возера размешчана ў басейне ракі Мухавец у 3-х км на паўночны ўсход ад вёскі Дзівін. Сярод вадаёмаў Кобрынскага раёна возера выдзяляецца сваімі памерамі. Плошча возера 1,83 км², даўжыня - 2,2 км, максімальная шырыня 1,4 км, найбольшая глыбіня 11,5 м, сярэдняя глыбіня 5,5 м. Для таго, каб абысці або аб'ехаць возера вакол, неабходна пераадолець адлегласць не менш за 5,7 км. Для таго, каб уявіць, якое возера вялікае, можна прывесці такую лічбу - аб'ём вады складае 10,83 мільёнаў кубічных метраў. Возера карставага тыпу. Схілы катлавіны на захадзе і ўсходзе спадзістыя, пясчаныя, вышынёй 4-5 м, параслі сасняком, на поўначы і поўдні невыразныя. Берагі нізкія, пясчаныя. У возера ўпадае рака Літкава і канал. На поўначы каналамі Казацкі і Дзівінскі возера звязана праз сістэму каналаў з Дняпроўска-Бугскім каналам. У возеры водзяцца такія віды рыб, як плотка, карась, лінь, акунь, шчупак. На сённяшні дзень на возеры Любань адзначаны птушакі: вялікая паганка, шэрая чапля, лебедзь-шыпун, лысуха, азёрная чайка, чайка-шызан, гогаль. Возера таксама з'яўляецца месцам адпачынку вадаплаўных птушак у час сезонных пералётаў. Наогул, тэрыторыя на ўсход ад возера вылучаецца сваёй унікальнасцю: тут забалочаныя мясціны, парослыя вольхай чорнай, чаргуюцца з дзюнамі, а на пясчаных глебах растуць сосны.



Возера Любань, размешчанае побач з Дзівінам, карыстаецца нязменнай папулярнасцю ў турыстаў, паляўнічых і рыбаловаў. У межах яго размешчаны турбазы і тэрыторыя дзіцячага аздараўленчага лагера «Хваля». Возера

таксама з'яўляецца месцам арганізаванага і «дзікага турызму» грамадзян. Непадалёку ад возера знаходзіцца «Паляўнічая хата», якая карыстаецца папулярнасцю, асабліва ў гасцей з-за мяжы.

На базе адпачынку «Камарова», размешчанай на беразе возера Любань могуць адначасова адпачыць каля паўсотні чалавек (16 нумароў і два сямейных дома (чатырох-мясцовы і шасцімесны). А ў банкетных залах на 250 і 60 пасадкавых месцаў ёсць выдатная магчымасць адсвяткаваць юбілеі, вяселлі, правесці карпаратывы і іншыя мерапрыемствы. Ёсць магчымасць пайсці ў міні-заапарк, пагуляць у футбол і валейбол, пакатацца на лодцы і роварах, пагуляць у більярд, прайсціся па экалагічнай сцежцы, папарыцца ў рускай лазні. Дарэчы, рыбалка на возеры для адпачываючых бясплатная.










# Спіс крыніц

**Агрогородок** «Дивинский» // Агрогородки Брестчины / гл. редактор В. Шпарко. – Брест, 2010. – С. 159.

**Амяльчук, С. М.** Дзівін / С. М. Амяльчук // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 291,292.

**Барыс, С. В.** Сцежкамі дзядоў : народны быт беларусаў / С. В. Барыс. - Мінск, 2015 - 295 с.

Уклад народнага жыцця ў беларускай вёсцы XIX і пачатку XX ст., ёсць фота ручнікоў, аддзення в. Дзівін.

**Бодак, А. Ю.** Проблемы восстановления советской власти на Полесье в первые месяцы после освобождения от немецко-фашистских захватчиков (на примере Дивинского района Брестской области) / А. Ю. Бодак // Брестская крепость: историко-культурный контекст : сборник материалов Междунар. форума преподавателей рус. яз. и лит. стран СНГ и Европы, Брест, 6-10 окт. 2014 г. - Брест, 2015. - С. 9-12.

**Габрусь, Т. В.** Дзівінская царква Параскевы Пятніцы / Т. В. Габрусь // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 292.

**Дзівін** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. – Т. 4. – С. 200.

**Дзівін** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 6. – С. 111.

**Дзівін** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4 Брэсцкая вобласць. – Мінск, 2007. - Кн. 2.. - С. 139-141.

**Дзівін** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2012. – Т. 3. - С. 394.

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы // Архітэктура Беларусі. – Мінск, 1982. – С. 88, 112, 113.

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы, Дзівінская царква Раства Багародзіцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 3. – С. 394, 395.

**Дивин** // Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 322-323.

**Дивин** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Мінск, 2006.- Т. 3. - С. 373-374.

**Дивинское** опытно-производственное лесничество // Кобринский опытный лесхоз. 70 лет. - Минск, 2011. - С. 113-118.

**Илларионова, Л.** Удивляй, Дивин! / Л. Илларионова // Брэстчына вачамі журналістаў. – Брэст , 2005. – С. 146–153.

**Князева, В. М.** Дзівін / В. М. Князева // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 576-578. – (З гісторыі населеных пунктаў).

**Любчук Сяргей Феадосавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2012. - Т. 5. - С. 188-189.

**Мешечко, Е. Н.** Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : путеводитель / Е. Н. Мешечко. - Брест, 2012. - С. 162.

**Ткачова, С.** Дзівін: аповед пра родную вёску / С. Ткачова // Берасцейскія карані – 98 : гісторыка-краязнаўчы зборнік. – Брэст, 1998. – С. 121–123.

**Цітоў, А.** Гарадская геральдыка Беларусі / А. Цітоў. – Мінск, 1989. – 207 с.

Са зместу: в. Дзівін Кобрынскага раёна – С. 53.

**Дзівінскі** шлях : газета для дзівінчан / аўтар матэрыялаў старонкі Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 20 красавіка. - С. 4.

**Дзівінскі** шлях : газета для дзівінчан // Кобрынскі веснік. - 2016. - 16 студзеня. - С. 4.

Адлюстроўваюцца навіны вёсак Дзівінскага с/с.

**Дубина, Л.** Валентина Пашкевич: «Наша продукция - для особого потребителя» / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 13 красавіка. - С. 2.

ИООО «Лангхайнрих Конфекцион Бел», работающее в д. Дивин с 2005 года, специализируется в основном на производстве постельного и столового белья.

**Петроченко, А.** Искусство быть собой / Анна Петроченко // Народная газета. - 2016. - 18 сакавіка. - С. 20.

Творческий путь Веры Усенко - художницы-самоучки из д. Дивин.

**Петроченко, А.** Куда приходит детство / Анна Петроченко // Рэспубліка. - 2016. - 21 студзеня. - С. 9.

Сегодняшний день Дивинского детского дома.

**Цыбулько, А.** СПК меняют вывески. И не только? / Анатолий Цыбулько // Сельская газета. - 2016. - 19 января. - С. 3.

В результате реорганизации колхозов произошло объединение СПК «Дружба народов» и ОАО «Любань».

**Пашкович, Л.** Любань приводят в порядок / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. - 2 студзеня. - С. 9.

Озеро Любань д. Дивин отдано в аренду ЧТУП «Брестская рыбная компания».

**Ярмошук, Н**. Отдохнуть? Легко! / Николай Ярмошук // Заря. - 2016. - 9 июня. - С. 4.

База отдыха «Комарово» расположена на берегу озера Любань в д. Дивин.

**Дзівінскі** шлях: газета для дзівінчан / аўтар матэрыялаў старонкі Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2015. - 24 кастрычніка. - С. 3.

**Дубіна, Л.** Жыватворная сіла народнай мудрасці / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. - 30 верасня. - С. 8.

Пра работу Дзівінскага Дома рамёстваў, які быў створаны 1 снежня 2008 г.

**Лесик, И.** Такая необыкновенная обыкновенная Вера / Ирина Лесик ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015. - 18 красавіка. - С. 4.

О жизни и творчестве дивинской художницы Веры Усенко.

**Пашковіч, Л.** Бярэты колеру веснавой зелені / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2015. - 27 мая. - С. 1, 3.

У Дзівіне размешчана пагранічная застава.

**Пашкович, Л.** «Наш бренд - формовый хлеб» / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2015. - 12 снежня. - С. 4.

Модернизация Дивинской хлебопекарни положительно отразилась на качестве продукции.

**Пашкович, Л.** Праздник - на одни пятёрки! / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2015. - 11 сакавіка. - С. 2.

Дивинский детский дом отметил 55-летний юбилей.

**Пашкович, Л.** У пограничников скоро новоселье / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2015. - 15 ліпеня. - С. 4.

Погранзастава «Дивин».

**Савлюков, С.** Доска под лазерным «прицелом» / [Сергей Савлюков ; беседовала] Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2015. - 24 кастрычніка. - С. 3.

Об участке по перерабатыванию древесины в Дивине Кобринского опытного лесхоза.

**Лесік, І.** Свята вуліцы Маладзёжнай / Ірына Лесік // Кобрынскі веснік. - 2014. - 16 жніўня. - С. 9.

Свята вуліцы Маладзежнай прайшло ў аграгарадку Дзівін.

**Марчук, Н.** Православные храмы Дивина / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2014. – 16 октября. – С. 11.

**Пуставіт, В.** Гаварыць з нябёсамі па-беларуску / Вераніка Пуставіт // Звязда. - 2014. - 4 снежня. - С. 5.

Кандыдат багаслоўя пратаіерэй С. Гардун (ураджэнец в. Дзівін).

**Шиферштейн, Д.** Выходные - в «Комарово»! / Дмитрий Шиферштейн // Вечерний Брест. - 2014. - 10 октября. - С. 8.

О базе отдыха «Комарово» (д. Дивин).

**Берднік, І.** Адкрыццё Айчыны / Іван Берднік // Народная трыбуна. - 2013. - 8 лютага. - С. 11.

Упамінаецца пасёлак Дзівін.

**Гармель, И.** Зачем в Дивин, что на Кобринщине, зачастили евреи со всего света?.. / Инна Гармель // Белорусская нива. - 2013. - 26 января. – С. 11.

О дивинском краеведе А. Н. Гапановиче.

**Жук, Е.** Лагеря стартуют в лето / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2013. - 31 мая. - С. 4.

Оздоровительный лагерь «Волна» продолжает оставаться востребованной оздоровительной базой.

**Лесик, И.** Юбилейный бенефис / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. - 2013. -21 верасня. - С. 12.

Дивинская сельская библиотека отметила своё 65-летие, Дивинская детская - 60-летний юбилей.

**Сергуц, Н.** Дивные салфетки из Дивина / Наталья Сергуц // Белорусская нива. - 2013. - 1 ноября. - С. 3.

Семь лет в д. Дивин работает совместное белорусско-немецкое швейное производство.

**Белов, Д.** С милосердием в душе / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2012. -12 мая. - С. 4.

О сестринском персонале Дивинской участковой больницы.

**Борисюк, Ю.** Неизвестная история памятников Великой Отечественной войны Дивина / Юрий Борисюк // Кобрин-информ. – 2012. – 10 мая. – С. 5.

**Бялоў, Д.** Папулярны Дом рамёстваў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 ліпеня. - С. 4.

Дзівінскі Дом рамёстваў.

**Даніловіч, В**. З гісторыяй у працы і жыцці / В. Даніловіч // Веды. - 2012. - 16 студзеня. - С. 7.

Сваё 60-годзе адзначыў кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. У. Смяховіч, ураджэнец в. Дзівін.

**Дзівінскі** абрус засцілае свет // Звязда. - 2012. - 28 жніленя. - С. 6.

Дзівінскае сумесные прадпрыемства «Лангхайнрых Канфекцыён Бел».

**Дзівінскі** шлях : газета для дзівінчан / аўтар старонкі Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 ліпеня. - С. 4. - Вып. 5.

**Гранік, С.** Дняпроўска-Бугскі рубеж. Як гэта было? / С. Гранік // ЛіМ. - 2012. - 22 чэрвеня. - С. 23.

Упамінаюцца Кобрын, Гарадзец і Дзівін.

**Лето** с рюкзаком // Вечерний Брест. - 2012. - 6 июля. - С. 1.

На Кобринщине открыт эколого-туристический маршрут «Любаньский», одним из пунктов которого является биологический заказник «Дивин-Великий лес».

**Пашкович, Л.** Всегда придут на помощь / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 10.

На попечении Дивинского участка Кобринского ТЦСОН находится 214 человек.

**Пашкович, Л.** От сосновой шишки до новогодней ёлки / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 10.

Дивинское лесничество является одним из самых больших в Кобринском районе.

**Пашкович, Л.** Одним абзацем / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 10.

В нынешнем году Дивин будет газифицирован на 100%.

**Пилипук, П.** СПК «Любань»: ориентиры на развитие // Заря. - 2012. - 12 июля. - С. 8.

**Бялоў, Д.** Прыходзьце ў наш дом! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2011. - 28 мая. - С. 2.

У Дзівінскім дзіцячым доме адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй.

**Жук, Е.** Осенний фест на сельской улице / Е. Жук // Вечерний Брест. - 2011. - 28 сентября. - С. 2.

В д. Дивин прошел 2-ой районный конкурс-фестиваль традиционной культуры «Золото полей».

**«Золото** полей - 2011» // Кобрин-информ. - 2011. - 29 сентября. - С. 1.

В д. Дивин прошёл фестиваль традиционной культуры.

**Пашковіч, Л.** Багацце продкаў – дзецям / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 3 верасня. - С. 12.

Дзівінскі дзіцячы дом.

**Пашковіч, Л.** Дзівіну - 545! / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 7 верасня. - С. 4.

545 гадоў з дня заснавання вескі адсвяткавалі жыхары Дзівіна.

**Пашкович, Л.** И в город ехать не надо / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 29 кастрычніка. - С. 4.

Кобринское райпо открыло в Дивине магазин непродовольственных товаров.

**Пашкович, Л.** Природный газ - уже у нас! / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 29 кастрычніка - С. 4.

В Дивине активно ведется газификация.

**Пашковіч, Л.** Тут пахне дубам і сасной... / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 29 кастрычніка - С. 4.

Дзівінскі цэх па перапрацоўцы драўніны.

**Рекуц, С.** Любань и Гать - сюда стоит приезжать / С. Рекуц // Заря. - 2011. - 23 апреля - С. 8.

Озеро Любань в д. Дивин с давних пор в почете у туристов.

**Гром, Г.** Шануюць народныя традыцыі / Г. Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 5 сакавіка. - С. 12.

Дзівінскаму народнаму хору - 40 гадоў.

**Шугай, В.** «Лангхайнрих шьёт красиво и мягко стелет» / В. Шугай // Заря. - 2011. - 13 января - С. 7.

Беседа с директором фирмы.

**Белов, Д.** Край лесной, озёрный.../ Д. Белов // Кобрынскі веснік. - 2010. - 16 чэрвеня. - С. 3.

Дивинское лесничество.

**Белов, Д.** Строятся ферма и жильё / Д. Белов // Кобрынскі веснік. - 2010. - 16 чэрвеня. - С. 3.

СПК «Любань».

**Бялоў, Д.** Ад школы-інтэрната - да дзіцячага дома / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 10 лютага. - С. 4-5.

Дзівінскі дзіцячы дом.

**Васюк, Н.** Юбилей с ноткой ностальгии / Н. Васюк // Кобрин-информ. - 2010. - 11 марта. - С. 3.

Юбилей Дивинской школы-интерната.

**Ковалёва, А.** Приходите в наш дом, наши двери открыты... / А. Ковалёва // Вечерний Брест. - 2010. - 26 февраля. - С. 4.

Дивинскому детскому дому - 50 лет.

**Дзівінскі** шлях : газета для дзівінчан // Кобрынскі веснік. - 2010. - 17 лютага. - С. 3.

Сучасны Дзівін.

**Пашкович, Л.** Чужих детей не бывает.../ Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2010. - 4 жніўня. - С. 2.

Дивинский детский дом семейного типа.

**Пашкович, Л.** Чем привлекает «Волна»? / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2010. - 31 ліпеня. - С. 4.

Лагерь «Волна» - один из лучших в районе.

**Рекуц, С.** Какой агрогородок не любит быстрой сети? / С. Рекуц // Заря. - 2010. - 13 ноября. - С. 4 ; Народная трыбуна. - 2010. - 13 лістапада - С. 2 ; Рэспубліка. - 2010. - 16 лістапада - С. 1 ; Кобрынскі веснік. - 2010. - 17 лістапада. - С. 1, 2.

В агрогородке Дивин открыт первый в области сельский центр общественного доступа в Интернет.

**Янченко, Н.** Онлайн-девятка обживается в агрогородках / Н. Янченко // Белорусская нива. - 2010. - 11 ноября. - С. 4 ; Вечерний Брест. - 2010. - 12 ноября. - С. 6.

Скоростной интернет в д. Дивин.

**Бялоў, Д.** Дзеля выхавання і адраджэння / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 22 красавіка. - С. 8.

Дзівінскі Дом рамёстваў.

**Бялоў, Д.** Золата палёў у залатых руках / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 17 верасня. - С. 12.

Дом рамёстваў у Дзівіне.

**Бялоў, Д.** Смак, які не забываецца / Д. Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2009. - 25 сакавіка. - С. 3.

Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Дзівінская хлебапякарня».

**Віннікава, М.** Фартушок, жанчыны гонар / М. Віннікава // Алеся. - 2009. - № 7. - С. 20-21.

Упамінаецца в. Дзівін Кобрынскага раёна.

**Гармель, И.** Мало просто подивиться / И. Гармель // Белорусская нива. - 2009. - 10 января. - С. 5.

О перспективах д. Дивин.

**Гринкевич, Т**. Особенности особой профессии / Т. Гринкевич // Советская Белоруссия. - 2009. - 26 ноября - С. 5.

Пограничная служба «Кобрин» и мобильная застава «Дивин».

**Митюков, А**. Бой после Победы / А. Митюков // Заря. - 2009. - 30 июля. - С. 7.

Почти 10 лет после войны Брестчину (Кобринский район, Дивин) терроризировали бандеровцы.

**Деревня** Дивин // Кобрынскі веснік. - 2009.- 14 студзеня. - С. 3.

О благоустройстве д. Дивин.

**Мороз, Е.** Подари тепло детям / Е. Мороз // Заря. - 2009. - 24 декабря. - С. 4.

Дивинская школа-интернат.

**О местном** биологическом заказнике «Дивин-Великий Лес» : решение Кобринского районного исполнительного комитета от 21 апреля 2009 г., № 536 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2009. - № 165. - 9/24098.

**Петроченко, И.** Детский дом вместо школы-интерната / И. Петроченко // Вечерний Брест. - 2009. - 23 сентября. - С. 3.

Дивинская школа-интернат реорганизована в детский дом.

**Белов, Д**. В Дивине - Дом ремесел / Д. Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 10 снежня. - С. 5.

В Дивине открылся Дом ремесел.

**Белов, Д.** В Дивине будет филармонический зал / Д. Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 22 кастрычніка. - С. 4.

Ремонт здания Дивинского ДК.

**Жук, Е.** Пригласительный из Дивина / Е. Жук // Вечерний Брест. - 2008. - 5 декабря. - С. 2.

В Дивине на базе школы народного творчества состоялось открытие Дома ремесел.

**Пянко, А.** Лесхоз развивает переработку / А. Пянко // Кобрынскі веснік. - 2008. - 15 лістапада - С. 3.

Дивинский деревообрабатывающиий цех Кобринского лесхоза.

**Сахута, Я.** Скарбы запаведнага краю / Я. Сахута // Мастацтва. - 2008. - № 6. - С.53.

Арыгінальныя знаходкі вызначаюць творчасць маладой майстрыхі з Дзівіна Ю. Піваваравай.

**Сацук, А.** Перемены на благо людей / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 12 ліпеня. - С. 2.

Дивин поменяет свой статус и станет агрогородком.

**Сацук, А.** Пірагі па заказу / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2008. - 10 верасня - С. 3.

Дзівінская хлебапякарня.

**Таболич, А.** Городок с приставкой «агро» / А. Тоболич // Заря. - 2008. - 14 июня. - С. 6.

О том, что необходимо сделать в будущих агрогородках д. Дивин, пос. Ореховский.

**300** долларов взамен пособия по безработице // Народная газета. - 2008. - 17 чэрвеня - С. 3.

Немецкий инвестор создал в Дивине сотню рабочих мест - ИП «Лангхайнрих Конфекцион Бел».

**Шугай, А.** Сапраўдны музей / А. Шугай // Кобрынскі веснік. - 2008. - 16 лютага. - С. 3.

Дзівінскі яслі-садзік.

**Яскевіч, С**. На здзіўленне Дывіну / С. Яскевіч // Звязда. - 2008. - 29 лістапада - С. 5.

Аб замежным прадпрыемстве ў в. Дзівін.

**Гармель, Е.** Встреча друзей - настоящий праздник / Е. Гармель // Заря. - 2007. - 10 марта. - С. 6.

Дивинская школа-интернат.

**Григорук, О. С.** Приезжайте к нам... лечиться / О. С. Григорук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 19 снежня. - С. 4.

Дивинская поликлиника и участковая больница.

**Остапук, О.** Новоселье в Дивине / О. Остапук // Кобрин-информ. - 2007. - 1 ноября. - С. 2.

Состоялось торжественное открытие нового здания Дивинского лесничества.

**Пянко, А.** Дивин накануне перемен / А. Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 1 снежня. - С. 2.

Строительство агрогородка в Дивине запланировано на 2008 год.

**Пянко, А.** Дом - колыбель детства / А. Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 12 декабря. - С. 2.

Дивинская школа-интернат.

**Селета** споўнілася 105 гадоў Прачысценскай царкве ў Дзівіне // Кобрынскі веснік. - 2007. - 15 жніўня. - С. 2.

**Петровская, М.** В местечке старом жизнь бурлит / М. Петровская // Кобрынскі веснік. – 2006. – 27 верасня. – С. 1.

Свята в. Дзівін.

**Уязны** знак в. Дзівін // Кобрынскі веснік. – 2005. – 15 кастрычніка.

**Дзівінскі сельсавет**: Візітная картка // Кобрынскі веснік. – 2004. – 24 красавіка. – С. 3–6.

**Илларионова, Л.** Удивляй, Дивин! / Л. Илларионова // Вечерний Брест. – 2003. – 9 июля. - С. 8–9.

**Пятроўская, М.** Дзівінскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 6 лістапада. – С. 1.

**Пятроўская, М.** Дзівінскія навіны / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2003. – 12 ліпеня. – С. 3.

**Пращурович, А.** Откуда имя твое, Дивин? / А. Пращурович // Заря. – 2002. – 26 февраля. – С. 3.

**Хільчук, М**. Жыў у Дзівіне юнак / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 16 лют. - С. 2.

М. Знахарчук, ураджэнец в. Дзівін, геройскі загінуў пры выкананні службовых абавязкаў на падводнай лодцы.

**Шугай, А.** Дзівін / А. Шугай // Кобрынскі веснік. – 2001. – 4 красавіка. – С. 3.

З гісторыі і пра сённяшні дзень сяла.

**Панасюк, М.** Дзівін дзівіць дзівам не толькі нашых суайчыннікаў, але і шматлікіх жаданых гасцей з розных краін / М. Панасюк // Беларуская думка. – 2000. - № 1. – С. 58-65 : фота.

**Ляўковіч, А.** Мой новы знаёмы – Дзівін / А. Ляўковіч // Звязда. – 1998. – 17 студзеня. – С. 5.

З гісторыі сяла, яго сучаснасць.

**Пянко, А.** Дзівін: на мяжы стагоддзяў / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 29 кастрычніка. – С. 2.

**Вёска** змяніла аблічча // Кобрынскі веснік. – 1996. – 16 кастрычніка. – С. 2.

**Алексяюк, А.** Дзівін: ведай свой край / А. Алексяюк // Камуністычная праца. – 1979. – 18 студзеня.

**Увасюк, Б.** Прыгажэе Дзівін / Б. Увасюк // Камуністычная праца. – 1973. – 1 мая.

**Дзівін** – 550 гадоў // Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016 год / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук ; рэдактар М. В. Іванова. – Кобрын, 2016. – С. 8-13.

# СПІС перыядычных выданняў,
# матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Алеся

Беларуская думка

Белорусская нива

Веды

Вечерний Брест

Заря

Звязда

Камуністычная праца

Кобрынскі веснік

ЛіМ

Мастацтва

Народная газета

Народная трыбуна

Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь

Рэспубліка

Сельская газета

Советская Белоруссия


ШЧАСЛІВАЙ
ДАРОГІ!
ПАМЯТАЙ
РОДНЫ КУТ!

# Змест

**Прадмова** 3

**I.** Дзівін: аповед аб вёсцы 5

**II.** Экскурс у гісторыю краю: храналогія асноўных дат 8

**III.** Дзівін дзівіць дзівам: паходжанне назвы сяла 13

**IV**. Помнікі, памятныя мясціны краю 15

**V.** Вядомыя людзі, ураджэнцы в. Дзівін 21

**VI.** Сучасны Дзівін 31

**Спіс крыніц** 40

**Спіс** перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік 50

# *Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні*

гісторыка-краязнаўчы нарыс
да 550-годдзя з часу першага ўпамінання
в. Дзівін Кобрынскага раёна

Складальнікі:
С. Д. Курачук*, гал. бібліёграф Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі;*
Д. С. Дардзюк, *бібліёграф Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі*

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Камп’ютарны дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
E-mail: kobrinlib@gmail.com